ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ (з дармовым дадаткам „Прафрух“)

На 1 мес. . . — 90 к.
„ 3 мес. . . 2 р. 60 к.
„ 6 мес. . . 5 р. —
„ 12 мес. . . 9 р. 75 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ

За радок нонп. васьля тэксту—50 к., іншагародняя абвесткі—1 р. за радок. Паскрод тэксту—у два разы дарожэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Звыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX-24 г. бярэцца 10 проц. надбавкі.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА“ Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ЗЬВЯЗДА

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЮ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

ТЭЛЕФОНЫ:
Рэдактар 10-74
Сакратар 6-19
Партсэктар . . . 13-60
Сэктар інфармацыі . 13-80
Пачны рэдактар . . 6-42
Галоўная кантора . 7-81
Адрэс падпіскі . 7-81
„ абвестак . . 7-81

ПЯТНІЦА 6 чэрвеня 1930 г.
№ 130 (3728)
Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА МЕНСК, Савецкая, 63.

XIII ЗЬЕЗД КП(б)Б

Пад цьвёрдым кіраўніцтвам свайго бальшавіцкага ЦК перамагаючы правых і „левых“ апартуністых у барацьбе за генэральную лінію партыі—КП(б)Б вядзе шырачэзныя масы рабочых, батракоў, беднякоў і сераднякоў вёскі па шляху сацыялістычнай рэканструкцыі ўсяе народнае гаспадаркі БССР

Спрэчкі па дакладу тав. Трылісера

аб рабоце Цэнтральнай Кантрольнай Камісіі УсеКП(б)

Прамова тав. Ляўкова

Палітычная лінія і ўся арганізацыйная работа Цэнтральнай Кантрольнай Камісіі УсеКП(б) адпавядала генэральнай лініі нашай партыі, адпавядала пастановам XV зьезду нашай партыі і XII зьезду КП(б)Б. Аб правільнасьці палітычнай лініі і арганізацыйнай расты ЦКК УсеКП(б) сьведчыць той факт, што партыя прыходзіць да XVI зьезду УсеКП(б), як ніколі, адзінай, гартаванай і здольнай перамагаць трудасьці сацыялістычнай рэканструкцыі сяе народнае гаспадаркі. Аб правільнасьці палітычнай лініі і ўсёй дзейнасьці ЦКК УсеКП(б) сьведчыць той факт, што за два з паловай гады ад XV да XVI зьезду партыі мы маем у справе сацыялістычнага будаўніцтва падзвычай вялікія посьпехі, маем посьпехі ў справе ажыцьцяўленьня бальшавіцкага лёзунгу самакрытыкі, маем падзвычай вялікую актыўнасьць як самой партыі, так і ўсяго пралетарыяту і батрацка-бяднацкіх сярэднацкіх мас вёскі.

Тав. Трылісер у сваім дакладзе адзначыў, што ў выніку работы праверкаў было выключана з партыі 10 проц. ад УсеКП(б), у нас-жа ў КП(б)Б гэты процант складае 10,5. Калі ўзяць галоўныя прычыны выключэньня, аб іх гаварыў тав. Трылісер і раней выступаўшы тав. Рыскін, то можна бачыць, што ператвараюць такія прычыны, як паслабленьне партыйнай дысцыпліны. У нас на КП(б)Б агульная колькасьць выключаных па гэтых праступках — 23 проц.

Выходзячы з гэтага, работа партыйных арганізацый КК на будучы час павінна быць пабудавана такім чынам, каб гэтыя зьявішчы папярэджваць, не дапускаць паўтарацца.

На сёньняшні дзень мы маем надзвычайна ўзрослую актыўнасьць партыйных мас. Мы маем надзвычай вялікую клясавую сьвядомасьць і актыўнасьць беспартыйных рабочых. І нам трэба работу КК перанесьці ў масы. Гаварачы аб гэтым, я маю на ўвазе, каб выраўнаньне большасьці спраў, якія ўзьнікаюць з тае ці іншае прычыны, КК былі перанесены непасрэдна ў ячэйкі, у калектывы, на вытворчасьць, ва ўстановы.

Вынікі чысткі нам паказалі, што ў радзе месц кіраўніцтва з боку райкомаў ячэйковай работай было пастаўлена недзадавальняюча. Перабудаваўшы работу кантрольных камісій такім парадкам, мы дасягнем таго, што будзем месц пастаянны нагляд за тым, як ажыцьцяўляецца кіраўніцтва ячэйковай работай з боку РК і гэта дапаможа пабудаваць кіраўніцтва так, як гэтага патрабуе партыя, як вымагае сучасная складаная работа.

Пераходжу да наступнага моманту. Тав. Трылісер у сваім дакладзе падкрэсьліў адносна двурушніцтва. XIII зьезд нашай партыі ў сваіх пастановах павінен ў гэтым пытаньні сказаць сваё слова з тым, каб завастрыць увагу ўсёй КП(б)Б на барацьбу з гэтымі зьявішчамі. Практыка работы кантрольных камісій і генэральная чыстка паказалі, што ў асобных ячэйках на гэтае пытаньне не зварачаецца ніякай увагі. Наадварот, былі выяўлены надзвычай адмоўныя і шкодныя настроі, што быццам у іх «усё добра», «усё спакойна». Напрыклад, адзін вясковы раён Гомельскай арганізацыі дае сваёй ячэйцы характарыстыку, што ў ячэйцы няма правых настроў, што ў ячэйцы таксама няма трацкісцкіх [illegible] што ячэйка здаровая і [illegible] ніцыруе генэральную лінію партыі, а ў часе чыст-



Рабочыя Гомельскага заводу імя Ланцуцкага ў тэрміновым парадку адмантавалі адзін паравоз і адзін вагон звыш праграмы.
На здымку: дырэктар заводу тав. Хімакаў і майстар зборачнага цэху даюць паравоз.

Прамова т. Дамброўскага

ЦКК УсеКП(б) ня толькі прарабіла вялікую работу па галоўнейшых вучастках барацьбы за генэральную лінію нашай партыі, у барацьбе за адзінства, за ачышчэньне радоў партыі, але побач са сваёй вялізарнейшай работай, вучыла партыю, вучыла арганізацыі, вучыла кантрольныя камісіі, як трэба змагацца, як трэба праводзіць работу.

Вялікая работа, якая прароблена ўсёй арганізацыяй пад кіраўніцтвам Цэнтральнага Камітэту УсеКП(б) і ЦКК УсеКП(б) — чыстка і праверка радоў партыі, якая нядаўна прайшла, дала цяпер значэньне большыя палітычныя вынікі, чым усе мінулыя чысткі. Маючы практыку ў гэтых адносінах, мы лепш падрыхтаваліся да чысткі, бо была прароблена вялізарная работа з боку ЦКК УсеКП(б) у сэнсе праінструктаваньня і своячасовай дачы указаньняў па гэтай рабоце. ЦКК УсеКП(б) трэба вынесьці рад пастаноў з поваду таго, каб пастановы, вынікі якіх мы вынесьлі з гэтай праверачнай работы, не засталіся-б у архіве. Мы ўжо цяпер маем сыгналізацыю аб тым, што ва многіх мясцох усе гэтыя вынікі вялікай работы, якая была прароблена па чыстцы, ляжаць цяпер над спудам. У некаторых ячэйках, ня гледзячы на тое, што ўжо прайшло каля паўгода пасьля чысткі, ячэйкі яшчэ ня выправілі тых памылак, якія былі ўказаны праверкомамі.

ЦКК УсеКП(б) павінна даць яшчэ адзін баявы загад для ўсёй арганізацыі аб тым, каб пастановы, якія вынесены ў часе праверкі, былі партыйнымі ячэйкамі выкананы на ўсе 100 проц.

У інтарэсах выяўленьня хваравітых зьявішч і ў інтарэсах ачышчэньня радоў партыі ад чужых, шкодных элемэнтаў трэба больш прыслухоўвацца да той нізавой масы, якая прымае актыўны ўдзел, падае матар'ялы, садзейнічае чыстцы.

Тав. Яраслаўскі даваў рад указаньняў, каб ня выпустошваць кантоўную работу, праведзеную ў часе чысткі, каб вельмі не прыдзірацца да форм, а мы маем з боку партсьледчага апарату часам гэткае залішняе патрабаваньне да дакумантаў, доказаў. Трэба ўлічваць, што не заўсёды можна тое ці іншае даказаць папяровымі дакумантамі. Трэба прымаць пад увагу паказаньні жывых сьведкаў, рабочых, якія даюць матар'ял у гэтым пытаньні і г. д. Не заўсёды матар'ял можа быць цалкам па 100 процантаў афармлен.

Прамова т. Кофцерава

Усесаюзная Цэнтр. Кантрольная Камісія УсеКП(б) прарабіла вялікую работу асабліва па асноўных чатырох пытаньнях. Гэта—барацьба за адзінства партыі, дабіваньне трацкізму, барацьба з правым ухілам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, чыстка радоў нашай партыі і чыстка сав. апарату. Кіраўніцтва гэтым пытаньнем асабліва па чыстцы партыі было дастатковае ня толькі у пісьмовай форме, але і ў жывой. Гэта пацьвярджаецца тым, калі члены ЦКК УсеКП(б) наведвалі ня толькі цэнтральныя установы, але і пабывалі на самой вёсцы. Напрыклад, да нас прыяжджаў т. Мазараў, які выяжджаў у Аршанчыну, пабываў непасрэдна на саміх ячэйках у часе чысткі. Адсюль мы маем тыя дасягненьні, аб якіх гаварыў дакладчык у сваім дакладзе, і тыя вялікія лічбы крыцягненьня мас да гэтай справы.

Я хачу спыніцца на нашай вытворчай каапэрацыі. Мне здаецца, што ў нас марудна ідзе справа з вопытнымі акругамі і пашырэньнем гэтага вопыту, асабліва ў сельскай-вытворчай каапэрацыі. «Цэнтры» ў нас нараджаюцца як грыбы пасьля дажджу, а нізавая сетка, якая павінна разьвівацца, закрываецца. Мы крычым, што ў нас няма спэцыялістаў, няма аграномаў, а аграномы сядзяць у гэтых цэнтрах, а калі вы спускаецеся ў сельсавет, на вёску, у калгас, там аграномаў няма.

Мне здаецца, правільна т. Якаўлеў у сваіх тэзісах паставіў пытаньне, што гэтыя цэнтры, асабліва акруговыя, трэба ліквідаваць і за лік іх пусьціць спэцыялістаў на вёску. ЦКК УсеКП(б) трэба заняцца гэтым пытаньнем як мага хутчэй.

Прамова т. Мундау

ЦКК УсеКП(б) за ўвесь час рашуча змагалася за ленінскую лінію партыі. ЦКК у сапраўднасьці выконвала заветы Леніна аб тым, каб пільна сачыць за правядзеньнем нашай партыйнай лініі. Поруч з гэтым мы тут павінны адзначыць і цэлы рад тых пытаньняў, якія павінны быць у далейшай працы ЦКК. Мы зараз ідзем шпаркім тэмпам да сацыялізму. Мы перабудоўваем на новы лад усё наша жыцьцё. Перад намі выпывае рад задач у працы рабоча - сялянскай інспэкцыі. Рабоча - сялянская інспэкцыя павінна праз шырокае ўцягненьне рабочых і бяднякоў - сераднякоў сялянства ўзяцца зараз за палепшэньне ўсяго нашага дзяржаўнага апарату.

Калі чытаць артыкулы тав. Леніна аб арганізацыі Рабкрына, цэлы рад пастаноў нашых зьездаў і канфэрэнцый, дык там проста гаворыцца, што ў органы КК-РСІ павінны падбірацца самыя лепшыя, найбольш вытрыманыя члены партыі. Калі гаварыць аб кіраўніках, дык я-б не сказаў, што ў нас у кантрольных камісіях дрэнныя таварышы, але наш рабочы апарат да гэтага часу ўсё яшчэ не на належнай вышыні. Я ня буду гаварыць наконт Віцебску, там справа ўжо крыху падпраўлена, але наогул у нашым апараце ёсьць таварышы, якія не спраўляюцца з тымі заданьнямі, якія на іх ускладаюцца. У той-жа час мы бачым, што з нашых розных партыйных навучальных устаноў кожны год выпускаецца значная колькасьць партыйных кадраў і ўсе гэтыя працаўнікі расмоктваюцца па розных установах, а да нас ніхто не нападае. І толькі з апошняга выпуску на курсах марксызму сёе-тое папала і ў органы КК.

Прамова т. Казачонка

Праведзеная ЦКК УсеКП(б), работа ў галіне чысткі партыі, чысткі савецкага апарту, падрыхтоўкі кадраў для нашай партыйнай сеткі і савецкага апарату і ў іншых галінах нашай работы, бязумоўна апіралася на шырокія партыйныя і беспартыйныя рабочыя масы, на батрацтва і бяднацтва ў вёсцы.

Гэта гаворыць аб тым, што практыка работы і партыйная лінія ў рабоце ЦКК УсеКП(б) адпавядаць задачам рэканструкцыйнага пэрыяду, — задачам выканаўня пяцігодкі за чатыры гады, рэканструкцыі сельскай гаспадаркі на сацыялістычных падставах, забесьпячэньня выкананьня генэральнай лініі партыі і захаваньня ленінскага адзінства радоў нашай партыі.

Побач з гэтымі дасягненьнямі ў рабоце ЦКК УсеКП(б) усё-ж такі, а лічу, неабходным спыніцца і на недахопах работы ЦКК УсеКП(б) і ніжэйшых кантрольных камісій.

Калі мы паглядзім на кадры, якія мы маем у вёсцы, то яны на сёньняшні дзень зьяўляюцца адносна слабейшымі, чым яны былі год таму назад. Хаця кадры на вёсцы цяпер лепшыя, але задачы ў нараўнаньні з мінулым годам у некалькі раз большыя, і ў гэтых адносінах у нас выхаваньне кадраў, падбор кадраў не адпавядае тым задачам, якія на сёньняшні дзень перад намі стаць.

Мы маем такое становішча ў асобных раёнах, што работа савецкага апарату пастаўлена надзвычай дрэнна, работа сэкцый РСІ пры РВК і сельсаветах нікудышная, у паасобных мясцох ніякіх сэкцый няма, яны існуюць толькі на паперы. Мы маем практыку ўзорнай работы амаль калі году часу па Віцебскай акрузе, але, на жаль, трэба сказаць, што аб узорнай рабоце на Віцебскай акрузе іншыя акругі Беларусі яшчэ ня ведаюць. А там, на Віцебшчыне, мне здаецца, асноўнае ў тым, што быў узят курс на максымальнае скарачэньне акруговых цэнтраў, на максымальнае скарачэньне акруговага апарату, і максымальнае палепшэньне якасна і колькасна апаратаў РВК і сельсаветаў.

На сёньняшні дзень для нас зьяўляецца карэннай задачай—зрабіць упор у гэтых адносінах на раёны, сельсаветы.

Зараз, калі мы возьмем работу сыстэмы с.-г. каапэрацыі ў вёсцы, мы на сёньняшні дзень маем такое становішча, што ўхаластую існуюць раённы і акруговы апараты с.-г. каапэрацыі, нізоўкі ніякай няма, акруговыя працаўнікі гастралююць у раёны, выдаткоўцца шмат грошай на аплату гэтых працаўнікоў. Адсюль і зрыў кантрактацыі. Калі мы гаворым аб слабасьці работы ў вёсцы, трэба спыніцца і на прычынах. Прычыны я лічу наступныя: першае—надзвычайная непадрыхтаванасьць, нізкі культурны ўзровень кадраў, а таксама і ўмовы надзвычайнай перагрузкі работы, дрэнная матар'яльная база для работы нашага савецкага апарату, у першую чаргу ў сельсаветах. Калі мы паглядзім, якія ў нас у вёсцы кадры сакратароў ячэек, то трэба сказаць, што гэта справа таксама абстаіць нездавальняючая. Частка вясковых сакратароў партячэек не адпавядае свайму прызначэньню; тое-ж самае паглядаецца і ў сельсаветах. Вось усё гэта да некаторай ступені і адбіваецца на рабоце. З гэтага нам трэба зрабіць вывад, што нам неабходна з усёй рашучасьцю ўзяцца за за выхаваньне кадраў.

Прамова т. Ефімава

Органы ЦКК прарабілі вялізарную работу за справаздачны пэрыяд часу. Цэнтральная Кантрольная Камісія павінна заняцца праверкай таго, як праводзяцца ў жыцьцё вывады, зробленыя праверкомамі. Мы ведаем рад фактаў, калі гэтыя вывады выконваюцца дрэнна.

Хачу закрануць пытаньне аб пэфэтве рабочых над савецкім апаратам. Тут гаварылі, што пры чыстцы партыі рабочых прымала ўдзел каля 11 млн. чалавек, але ніхто не гаварыў аб тым, які ўдзел прымалі рабочыя ў чыстцы савецкага апарату. Тут быў вялізарны промах з боку партыйных арганізацый, бо на чыстку савецкага апарату ва многіх мясцох мала зварачалася ўвагі.

Далей, я хачу закрануць пытаньне аб работніках кантрольных камісій, якія працуюць на мясцох. Мне здаецца, што члены АКК мала зварачалі ўвагі на непасрэдную работу на вытворчасьці. Члены АКК мала зьвязаны з тэй работай, якая вядзецца на вытворчасьці.

Прамова т. Сьвірыдава

ЦКК УсеКП(б) бязумоўна прарабіла вялізарнейшую работу на ахове адзінства партыі, барацьбе супроць правага ўхілу, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, барацьбе супроць рэштак трацкісцкай апазыцыі. ЦКК УсеКП(б) прароблена вялікая работа па чыстцы партыі, чыстцы савецкага апарату. Праведзеная работа з боку ЦКК КП(б) зьяўляецца бясспрэчна вялікай.

На лініі праверкі радоў нашай партыі была праведзена надзвычайна вялікая і адказная работа ў галіне разгортваньня крытыкі і самакрытыкі, уцягненьня рабочых і батрацка-бяднацкіх мас у партыю. У гэты пэрыяд мы мелі вялізарнейшыя ўступленьні рабочых у рады партыі.

Дзякуючы разгортваньню крытыкі і самакрытыкі, мы змаглі выявіць тыя хваравітыя зьявішчы, якія мелі месца ў радох партыі.

Разгортваньне крытыкі і самакрытыкі, як сродку, які выяўляе балючыя зьявішчы на даным этапе, дапамагае выпраўленьню гэтых хваравітых зьявішч, ва многіх мясцох на сёньняшні дзень яшчэ не зрабілася сродкам выяўленьня хваравітых зьявішч. Ва многіх мясцох мы яшчэ не накіравалі крытыку і самакрытыку на выяўленьне хваравітых зьявішч, якія ёсьць у тых ці іншых гаспадарчых органах.

З боку ЦКК УсеКП(б) павінна быць зьвернута асаблівая ўвага на плянуючыя органы, дзе яшчэ ёсьць некаторая няўвязка ў плянавасьці мясцовай прамысловасьці. Часта па існуючых плянах няма будаўнічых матар'ялаў, жалеза і інш., што не дае магчымасьці сваёвова разгарнуць будаўніцтва, а адсюль выцякае спазьненьне з разгортваньнем будаўніцтва.

У справе праектаваньня таксама ёсьць вялікія дэфэкты. У нас у Аршанчыне будуецца ільна-камбінат, які праектаваўся яшчэ ў мінулым годзе. Калі складаліся праекты, дык ня было яшчэ ўсіх чарцяжоў. Прыступілі да будаўніцтва, пабудавалі часальны корпус і потым аказалася, што там зусім - не даволі сьвятла для таго, каб днём працаваць. Затым галоўны корпус спраектавалі, а на сёньня аказалася, што трэба перапраектаваць. Фундамант, які залажылі, аказаўся нягодны і яго трэба было разабраць і закладваць новы. Усё гэта павялічвае кошт пабудовы ільна-камбінату. Такія промахі пры тым вялізарнейшым будаўніцтве, якое ў нас ёсьць, нельга цярпець. Мне думаецца, што в боку ЦКК УсеКП(б) павінна быць на гэта зьвернута ўвага. ЦКК павінна паставіць пытаньне аб тым, каб гаспадарнікі давалі адказы на тыя артыкулы, якія зьмяшчаюцца ў пасьцегазэтах і ў нашай прэсе, бо не заўсёды нашы работнікі даюць адказы на гэтыя артыкулы.

Прамова т. Нартышблука

Работа ЦКК і работа кантрольных камісій на мясцох, а таксама і ўсёй партыі ў цэлым за мінулыя два гады з часу XV зьезду партыі была прароблена вялізарная і гістарычная.

Мы маем яшчэ шмат недахопаў у нашым савецкім апараце. Мы вельмі часта гаворым аб узмацненьні нашага савецкага апарату, аб прыцягненьні рабочых сіл у савецкі апарат. Але калі запытаць, ці ўсё мы выканалі ў гэтых адносінах, — далёка яшчэ ня ўсё. Мы маем шмат застарэлага ў савецкім апараце. Мы павінны палепшыць работу. Мы павінны даць лепшыя сілы ў савецкі апарат. Прыдзецца прарабіць значную работу, каб узмацніць наш савецкі апарат. Калі ня ўзмоцнім савецкі апарат як належыць, то нам будзе цяжка ажыцьцяўляць пяцігадовы плян нашага будаўніцтва.

Сыстэма работы савецкага апарату ва многіх выпадках зьяўляецца яшчэ далёка непрыстасаванай да сучасных тэмпаў работы. Калі ўзяць абсят фінансавападаткоўны, то маем надзвычай складаны ланцуг у падатковай рабоце. Для таго, каб прыцягнуць рабочага, азнаёміць яго з работай гэтага апарату, трэба патрацінь шмат часу і ён не ўсьвядоміць гэтай мудрасьці. Мы маем цэлы рад відаў усіх падаткаў, усякага роду выччэньняў замыславатых, шмат неразьбярыхі. Нам трэба ў гэтым апараце работу зьмяніць, спрасьціць, каб апарат лепш мог справіцца са сваёй работай. Гэтае пытаньне ўжо высоўвалася даўно. Мы доўгі час гаворым аб спрашчэньні і зьмене структуры, але гэтае пытаньне яшчэ ня вырашана і мы ўсё яшчэ застаемся ў тым-жа становішчы.

Стварэньне кадраў. Мы, праўда, вельмі часта і шмат гаворым аб стварэньні кадраў, і гэта правільна. Мы ўпіраемся ў пытаньне аб кадрах. Мы шмат трацім сродкаў на кадры, але мне здаецца, што гэтыя сродкі не даволі мэтазгодна выдаткоўваюцца. Мы намячаем мерапрыемствы аб стварэньні кадраў—па кожнай акрузе, па кожнай галіне, трацім па гэта вялізныя сродкі (на 100 тысяч руб. у кожнай акрузе). Па адцэй Беларусі мы трацім звыш мільёна руб., а эфэкту належнага ня маем. Гэта пытаньне невыстарчальна прапрацавана. У нас атрымліваецца тое, што нашы кадры праз 2-3 месяцы ідуць па другім назначэньні, а не па тым, на якім мы намячаем. Трэба ўпарадкаваць гэту справу, з'эканоміць сродкі і выдаткаваць іх больш мэтазгодна. Органы кантрольнай камісіі і РСІ павінны зьвярнуць увагу на гэты абсяг работы.

Дэлегацыя рабочых заводу імя Ланцуцкага, якая прыехала вітаць зьезд.

Дзеньнік зьезду

На ранішнім пасяджэньні ад 4 чэрвеня працягваліся спрэчкі па дакладу ЦК КП(б)Б. У спрэчках выступілі наступныя таварышы: Віленская, Аляксандраў, Каждан, Карцова, Лук'янаў, Дзем'янчык, Хандропі, Дзякаў, Клебанаў, Кінэр, Нікіфараў, Арашчук, Тамашэўскі, Голубава, Траянкер, Вайман, Шаін, Чарнушэвіч, Аксючыц, Мінін, Ягораў, Крылоў.

У канцы ранішняга пасяджэньня зьезд прывітала дэлегацыя ад рабочых Гомельскага заводу імя Ланцуцкага.

Тав. Вягін, які выступіў ад імя рабочых заводу імя Ланцуцкага, сказаў:

— На сёньняшні дзень мы палкам ліквідавалі прарывы ня толькі першага кварталу і першага паўгодзьдзя, мы маем выкананьне 100 проц. па трэці квартал. Пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі заводу, пры поўным уваўленьні рабочымі ўсяго заводу цягавазборнага цэху мы 28 мая абгаварылі пытаньне аб тым, каб да XIII зьезду КП(б)Б выпусьціць звыш нормы адзін паравоз. І сёньня гэты цягнік з вагонам прыйшоў сюды ў Менск.

Ад імя рабочых і служачых будуючайся фабрыкі штучнага шоўку ў Магілеве выступіў тав. Міндлін, ад інжынэрна-тэхнічнага пэрсаналу тэй-жа фабрыкі выступіў тав. Барун.

Ад калгасу імя Дзяржынскага Калінкавіцкага раёну, Мазырскай акругі, выступіла тав. Кучынская.

Ад калгасу імя «Зьвязды» выступіў тав. Макеяў і ад калгасу «Камінтэрн» тав. Сьвідкоўскі.

З адказам на прывітаньні ад імя зьезду выступіў тав. М. М. Галадзед.

* * *

На вячэрнім пасяджэньні па дакладу ЦК КП(б)Б выступілі т.т. Агільнік, Пушчын, Крацэр, Адамовіч, Гельман, Пятушкоў, Гофман, Бурава, Сапун, Бэнэк, Чанёлкін, Арапштам, Каровін, Кедараў, Арнольдаў.

У канцы пасяджэньня прывіталі зьезд т. Міронепка ад імя калгасьнікаў Гомельшчыны і т. Семчан-ад-жалг. Бабруйшчыны.

* * *

На ранішнім пасяджэньні 5 чэрвеня працягваліся спрэчкі па справаздачы ЦК КП(б)Б. Выказаліся т. т. **Хацкевіч, Анісаў, Рэзьнікаў, Віленстовіч, Шпак, Крохмаль, Левіт, Кавальчук, Штэйман, Маўшовіч, Платун, Чухман, Чычэраў, Палякоў, Астапенка, Шпектараў, Мазур, Іваноў і Гантман.**

У канцы ранішняга пасяджэньня зьезд віталі дэлегацыі ад №-скай авіяцыйнай брыгады імя Саўнаркому Беларусі і ад складу лётнікаў гэтай-жа брыгады.

Тав. **Аляксеяў**, які выступіў ад імя лётнікаў, сказаў:

— Наш атрад вышаў у канцы мінулай зімы з добрымі якаснымі паказчыкамі па баявой падрыхтоўцы. Палітыка-маральны стан атраду — добры. Атрад з лютага 1930 г. — ударны. На першым заклику Камуністычнай партыі і рабочае клясы мы гатовы стаць на абарону межаў СССР.

Ад лётнага складу №-скай авіябрыгады з прывітаньнем выступіў тав. **Малышаў.**

— Наш атрад пільна сочыць за аховай межаў Савецкага Саюзу ад нападу імпэрыялістых. Наш атрад да XVI партзьезду будзе складацца выключна з ударнікаў. Атрад за зімовую вучобу прэміраваны камандаваньнем Беларускай вайсковай акругі.

Палітыка - маральны стан нашага атраду — добры. Кожны баец цьвёрда трымае ў сваіх руках аружжа і пільна сочыць за міжнародзнай абстаноўкай. Атрад гатоў на першым заклику Камуністычнай партыі і савецкай улады выступіць на абарону завадоў Кастрычніцкай рэвалюцыі і нападу імпэрыялістых.

З адказам на прывітаньні ад імя зьезду выступіў тав. **Кавальчук.**

* * *

На вячэрнім пасяджэньні працягваюцца спрэчкі па справаздачы ЦК КП(б)Б. Выступілі т. т. **Яфімаў, Вэйс, Лаціс, Каменштэйн, Сысоеў, Судакоў, Саладоўнікаў, Карнеяў і Славінскі.**

У канцы пасяджэньня зьезд вітала дэлегацыя рабочых і работніц Гомельшчыны. Дэлегацыя пасьля прывітаньня перадала прэзыдыуму зьезду рапорты 11 буйнейшых прадпрыемстваў Гомельшчыны.

Ад імя дэлегацыі выступіў рабочы лесазаводу «Коллективный Труд», работніца Добрускай фабрыкі т. Папова і іншыя, якія запэўнілі зьезд, што прамфінплян імі будзе выкананы.

З адказам на прывітаньні ад імя зьезду выступіў тав. Аверын.

На здымку: дэманстранты праходзяць каля Дому Культуры, дзе адбываецца зьезд.

Прамова т. Грысевіча

(Адказ ад імя зьезду на прывітаньні рабочых дэлегацый)

Таварышы, сёньняшняя дэманстрацыя працоўных Менску сьведчыць аб глыбокай сувязі нашай партыі з шырокімі працоўнымі масамі. Тыя прывітаньні, якія мы заслухалі ад працоўных Менску, Воршы і Бабруйску, ад с.-г. лес. рабочых, ад калгасьнікаў Бабруйшчыны і Меншчыны, яшчэ раз пацьвярджаюць аб глыбокай рабоце, якую прарабілі мы, аб тым глыбокім даверы з боку батрацка-бяднацка-сераднацкіх сялянскіх мас да нашай партыі.

Той лёзунг, які зараз праводзіцца ў жыцьцё—пяцігодка за чатыры гады—патрабуе ад нас, каб у другое пяцігодзьдзе гэтага году прарывы, якія аказаліся ў нашай прамысловасьці, выправіць.

Таварышы, тыя запэўніваньні, якія тут рабіліся навуковымі працаўнікамі, настаўніцтвам і інжынэрна-тэхнічнымі працаўнікамі гаворыць аб тым, што тыя задачы, якія зараз партыя ставіць, як лёзунг, які зараз ператварацца ў жыцьцё—пяцігодку за чатыры гады—бязумоўна выканаем. Для выкананьня пяцігодкі нам трэба забясьпечыць нашу прамысловасьць тэхнічнымі сіламі.

Трэба сказаць, масы сёе нас яшчэ ў справе нашу ён абслугоўвае, [illegible] рабочай сілы, інжынэрна-тэхнічнага, настаўніцкага складу яшчэ недастаткова праароблена работы для таго, каб ажыцьцяўляць нашу пяцігодку за чатыры гады. Таму перад нашымі навучальнымі ўстановамі, перад нашым інжынэрна-тэхнічным пэрсаналам стаіць задача рабіць тое, што рабочая класа—ажыцьцяўляць пяцігодку за чатыры гады, прарывы, якія ў нас ёсьць на культурным фронце, у падрыхтоўцы тэхнічных кадраў, каб былі напоўнены, як мае хутчэй.

Пад кіраўніцтвам партыі мы пойдзем яшчэ шпарэй на шляху сацыялістычнага будаўніцтва, пастановы, якія вынесе нам XIII зьезд, ЦК КП(б)Б., бязмоўна пры дружным падтрыманьні ўсяе рабочае клясы, батрацка-бяднацкіх і сераднацкіх мас, усяго культурна-тэхнічнага пэрсаналу нашай Беларусі будуць праведзены ў жыцьцё. (Воплескі).

Працяг спрэчак па дакладу тав. Трылісера глядзі на 4 старонцы

ДАКЛАД Т. МАНУЛЬСКАГА глядзі на 3 і 4 старонках

Адкрылася другая Маскоўская абласная партканфэрэнцыя

Тав. Кагановіч абвяшчае другую Маскоўскую абласную партканфэрэнцыю адкрытай.

У прэзыдыум канфэрэнцыі выбрана 35 чал., у тым ліку т. т. Кагановіч, Яраспаўскі, Арджанікідзе, Ляснаў, Уханаў, Булат, Рындзін, Коган Караваеў, Чэмаданаў, Бельскі, Горава, Ягада, Стрыеўскі, Казлоў, Рабаў, Давідсон, Шырын, Міхалеўскі, Крондэр, Носаў Сядзельнікаў, Калыгіна, Фёдарава, Панкілава, Будзёны і іншыя.

ПРАМОВА ТАВ. КАГАНОВІЧА

Мы жывем і працуем у выключна гістарычнай абстаноўцы. 2 з пал. гады, якія аддзяляюць нас ад XV зьезду партыі, запоўнены вялізарнейшымі гістарычнымі падзеямі ва ўсіх галінах жыцця ня толькі нашай партыі і краю, але і сусьветнага пралетарыяту.

На аснове рашучага сацыялістычнага наступленьня рабочая кляса, пад кіраўніцтвам ленінскай партыі, узмацніла абароназдольнасьць і незалежнасьць нашага краю ажыцьцяўляе нябачаныя тэмпы індустрыялізацыі, прыступіла да карэннай сацыялістычнай перабудовы сельскае гаспадаркі і пачала ажыцьцяўляць такой гістарычнай важнасьці лёзунг, як ліквідацыя кулацтва, як кляса, у раёнах суцэльнай калектывізацыі.

Практычнае ажыцьцяўленьне пяцігадовага пляну вялікіх работ выявіла буйнейшыя гістарычныя пераваги сацыялістычнае гаспадаркі, якія забясьпечваюць нам магчымасьць скарочаных тэрмінаў набудовы сацыялістычнага грамадзтва. Імкнна гэта і садзейнічала вылучэнню масамі лёзунгу «Пяцігодка—у чатыры гады». Калі год назад правыя апартуністы, якія ўлалі ў паніку перад грандыёзнасьцю і труднасьцямі нашага будаўніцтва, прапаведвалі адступленьне ад пяцігодкі, пад сьцягам «рэальных тэмпаў», то зараз разьбіты і прымушаны пад жорсткімі ўдарамі партыі капітулянты, лідэры правага ўхілу паваг не ўлаважаюцца адкрыта выступаць супроць генэральнай лініі партыі, супроць яе правадніка Ленінскага ЦК (аплёдысмэнты).

Таварышы, наша партыя цьвёрда кроч ыць наперад з грунтоўна абдуманым планам на аспоўным шляху, вызначаным Леніным. Партыя і яе ЦК дасканала памятаюць дырэктыву вялікага правадыра, што кіраўніцтва працоўнымі і экспляатаванымі масамі можа ажыцьцяўляць толькі кляса, якая бяз хістаньню ідзе на сваім шляху». Маскоўская парторганізацыя прыходзіць да другой абласной канфэрэнцыі і да XVI зьезду партыі стройнымі згуртаванымі радамі пад сьцягам ленінізму, пад сьцягам генэральнай лініі партыі і яе ЦК (аплёдысмэнты). Маскоўская канфэрэнцыя пройдзе пад дэвізамі: супроць рэвізіі генэральнай лініі нашай партыі ў прынцыпе і на практыцы; супроць правых ухілістых, лінія якіх вядзе не да сацыялізму, а да капіталізму, супроць прымірэнцтва да правага ўхілу; супроць «левых» перагібаў, супроць прымірэнцтва да іх; за яшчэ большую згуртаванасьць партыі наўкола свайго Ленінскага ЦК; за ленінскае адзінства партыі; за перамогу сацыялізму ў СССР; за перамогу сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі (аплёдысмэнты).

У ганаровы прэзыдыум над аплёдысмэнты ўсяго залі аднагалосна абраны наступныя т. т. **Сталін, Молатаў, Калінін, Варашылаў, Рыкаў, Куйбышаў, Рудзутак, Арджанікідзе, Кагановіч Мікаян, Кіраў, Касіёр, Тэльман і Блюхэр.** На вячэрнім пасяджэньні з дакладам ЦК УсеКП(б) выступіў, спатканы доўгімі аплёдысмэнтамі т. Кагановіч.

На вячэрнім пасяджэньні Маскоўскай абласной партканфэрэнцыі 4-га чэрвеня працягваліся спрэчкі па дакладу ЦК. Усе прамоўцы аднадушна ўхвалілі генэральную лінію партыі. Пытаньню аб кадрах і ролі камсамолу ў гэтай справе прысьвяціў сваё выступленьне т. **Чамаданаў** (ЦК УсеЛКСМ).

На вячэрнім пасяджэньні выступіў спатканы цёпла канфэрэнцыяй т. **Будзёны.** Тав. Будзёны, спыніўшыся на міжнародным становішчы, адзначыў, што ку цепаўшчына, крызісны паход і пякельная машына—усё гэта зьвенькі аднаго ланцугу правакацый імпэрыялістых супроць Савецкага Саюзу.—Мы моцны, кажа ён, і мацнеем яшчэ больш з кожным днём у выкананьні пяцігадовага пляну народнае гаспадаркі.

Пасьля т. Будзёнага выступіў т. **Лазоўскі** (Прафінтэрн) з вялікай прамовай аб рэвалюцыйных падзеях у Індыі.—Рэвалюцыйныя штурмкі, кажа т. Лазоўскі, паралізуюць нэрвовую сыстэму ангельскага імпэрыялізму.

Спыняючыся далей на рэвалюцыйных падзеях у Кітаі, т. Лазоўскі гаворыць, што савецкія раёны ўжо напырылі свой уплыў на 70 мін. насельніцтва.

У канцы вячэрняга пасяджэньня зьявіўся т **Калінін**, які быў спатканы бурнымі аплёдысмэнтамі. **Дэлегаты канфэрэнцыі ўсталі з месц і наладзілі т. Калініну доўгую авацыю.** У адказ на настойлівыя і яснымаючыяся просьбы членаў канфэрэнцыі т. Калінін зьвярнуўся да дэлегатаў з кароткім прывітальным словам. Учора на вячэрнім пасяджэньні канфэрэнцыю віталі дэлегацыі буйнейшых прадпрыемстваў Масквы.

Прадстаўнікі «Электразаводу» заявілі, што падарункам канфэрэнцыі зьяўляецца вызваленьне нашага краю ад увозу з-за граніцы высокавольтных трансфарматараў, дзякуючы разгортаньню іх вытворчасьці на «Электразаводзе».

Новыя ахвяры фашысцкіх нападаў

У апошнім часе ў Нямеччыне больш частыя выпадкі арганізаваных нападаў фашыстых на рэвалюцыйных рабочых.

26-га мая ў Бэрліне фашыстымі былі забіты двое рабочых — Селяноўскі і Гэймбіргэр.

Пахаваньне ахвяр азьвярэлага фашызму абярнулася ў магутную дэманстрацыю пратэсту, у дэманстрацыі прымала ўдзел некалькі тысяч рабочых. Значная колькасьць паліцэйскіх суправаджала дэманстрацыю і некалькі разоў атакавала рабочых, у выніку — цяжка параненыя.

На здымку: забітых рэвалюцыйных рабочых апускаюць у магілу.

Фронт контрнаступленьня нямецкага пралетарыяту пашыраецца

Сацыял-фашыстыя лезуць з скуры, каб сарваць барацьбу нямецкіх рабочых

ПАДЗЕІ Ў МАНСФЭЛЬДЗЕ — АДКАЗ НА НАСТУПЛЕНЬНЕ КАПІТАЛІСТЫХ

БЭРЛІН, 4. Орган кампартыі «Ротэ Фане» апублікаваў адозву да нямецкіх рабочых адносна мансфэльдскай забастоўкі. Адозва называе падзеі ў Мансфэльдзе **адказам нямецкага пралетарыяту на наступленьне прадпрыемцаў** і арбітражных камісій па зарплаце. **«Рабочыя Нямеччыны,** — канчае адозва — **павінны мабілізэваць усе сілы для перамогі мансфэльдзкіх гарнякоў». (ТАСС).**

УСЬЛЕД ЗА РАБОЧЫМІ КАПАЛЬНЯЎ І ЗАВОДАЎ

БЭРЛІН, 4. Барацьба Мансфэльдзкіх рабочых выклікае вялікую забастовачную хвалю. **Барацьба, якая разгортваецца супроць наступленьня прадпрыемцаў на зарплату, працякае пад кіраўніцтвам прафпазыцыі.** Усьлед за рабочымі капальняў і заводаў Мансфэльду абвясьцілі забастоўку партыйныя рабочыя Кёнігсбэргу. Перагаворы паміж прадпрыемцамі і прафсаюзнай бюракратыяй аб адпачэньні калдагавароў, тэрмін якіх канчаецца еў канцы чэрвеня, скончыліся бяз выніку. (ТАСС).

«ПАМІЖ ЧЫРВОНАЙ ПАВЯЗКАЙ І ЧЛЕНСТВАМ У САЮЗЕ»

БЭРЛІН, 4. У Мансфэльдзкім раёне рэфармістыя прабуюць жорсткім цкаваньне рэвалюцыйнай прафпазыцыі ўтрымаць свой уплыў у масах, які ўсё больш зьніжаецца. У Гольбры яны выпусьцілі адозву, у якой заклікаюць рабочых не паведваць рэвалюцыйных дэманстрацый і сходаў і ня даць «камуністычным скандалістам» перашкаджаць забастоўцы. У Гёдштэдце і ў іншых мясцох яны абвясьцілі рабочым, якія з чырвонымі павязкамі на руках з надпісам: «Пралетарская самаабарона» прыйшлі запісвацца ў забастовачныя сьпісы прафсаюзаў, што яны павінны выбіраць паміж чырвонай павязкай і членствам у прафсаюзе. (ТАСС).

НОВЫЯ 2.400 ВУГЛЯКОПАЎ — НА ВУЛІЦУ

БЭРЛІН, 4. На капальнях «Фэрэйнытэ Штальвэркэ» у Гельзенкіркэне адміністрацыя абвясьціла аб звальненьні 2.400 рабочых. ТАСС).

«МЫ ХОЧАМ РАБОТЫ І ХЛЕБА»

БЭРЛІН, 3. Сёньня ў цэнтральным раёне Бэрліна адбылася вялікая дэманстрацыя беспрацоўных. Дэманстранты прабавалі прайсьці да ратушы, але апошняя была абкружана моцным паліцэйскім кардонам. Калі сярод беспрацоўных раздаліся воклічы: «мы хочам работы і хлеба», паліцыя напала на дэманстрантаў і многіх арыштавала. (ТАСС).

СТРАШЭННАЕ ЗДРАДНІЦТВА

БЭРЛІН, 5. У цэнтры ўвагі палітычных колаў Нямеччыны стаіць таямнічы перагавор паміж прафсаюзнымі бюракратамі і прадпрыемцамі аб супрацоўніцтве ў правядзеньні ўсеагульнага зьніжэньня зарплаты, зьніжэньня сацыяльных выдаткаў і спышненьне эканамічнай барацьбы рабочых. Прадпрыемцы сьцьвярджаюць, што перагаворы праходзяць пасьпяхова і што ў бліжэйшым часе яны будуць давядзены да канца. Паміж бакамі ўжо дасягнута згода аб зьніжэньні зарплаты і адпачэньні супрацоўніцтва паміж цэнтральнымі арганізацыямі прадпрыемцаў і прафсаюзаў.

«Ротэ Фане» заяўляе, што ў масах нямецкага пралетарыяту вестці аб гэтым страшэнным здрадніцтве рэфармістых выклікаюць нячуванае абурэньне. Прафсаюзныя правадыры, якія атрымліваюць сваю пэнсію з рабочых грошай, ідуць да прадпрыемцаў, просяць іх весьці перагаворы і самі прапануюць сябе для супрацоўніцтва з прадпрыемцамі, накіраванага супроць рабочых. На заводах і прафсаюзных сходах рабочыя патрабуюць абгаворваць страшэнныя планы прафбюракратаў і выставіць наступныя лёзунгі: «Не дапусьціць зьніжэньня зарплаты; за 7-мігадзінны рабочы дзень з захаваньнем поўнай аплаты; за прадастаўленьне беспрацоўным работы на заводах; за барацьбу супроць манаполіі прафсаюзаў на заключэньне калдагавароў і за выгнаньне служкаў прадпрыемцаў з прафсаюзу». «Сёньня, — канчае «Ротэ Фане» — мільённыя масы нямецкіх рабочых павінны зразумець, што толькі рэвалюцыйная прафсаюзная апазыцыя ў стане арганізаваць барацьбу рабочае клясы і кіраваць гэтай барацьбой».

ПАСЬПЯХОВА ВЫКОНВАЕМ СЯЎБУ

МАСКВА, 4. Паводле даных НКЗ СССР, на 31-га мая было засеяна 69.773 тысячы гэкт. (на 25 мая было засеяна 63 мін. 831.000 гэкт.). Пасеўны плян па раёнах, якія ўступілі ў сяўбу да 31 мая, выкананы на 75 проц. У калгасах засеяна 31-га мая 28.604.000 гэкт. у індывідуальных гаспадарках — 38.497.000 гэкт. і ў саўгасах 2.672.000 гэкт.

НЕДАПУШЧАЛЬНА МАРУДНА

МАСКВА. Паводле рэстак Хлебацэнтру прыёмка аддалёнага складзкага ланцугу і перадача кадраў хлебных работнікаў спажывецкай кааперацыяй і Саюзхлебам хлебнай кааперацыі праходзяць недапушчальна паволна. Мясцом запрапанавана ў бліжэйшыя дні дабіцца рашучага пералому ў гэтай рабоце. Прыёмка складаў павінна быць скончана не позьней 10 чэрвеня. (ТАСС).

ПРОДОЛЖЕН

ДО 10 ИЮНЯ

ПРИЕМ ПОДПИСКИ НА ИЮНЬ

НА ГАЗЕТУ „ПРАВДА"

Все желающие обеспечить себя ежедневным получением «ПРАВДЫ» за время работ XVI ПАРТСЪЕЗДА должны подписаться на июнь не позднее указанного числа. В виду огромного увеличения подписчиков из июня в розничную продажу газета будет поступать в ограниченном количестве.

Белорусское Отделение „ПРАВДА"—Советская, 61.

Водгукі Віленскай фашыстоўскай прэсы на артыкулы т. т. Васілевіча і Сянкевіча

Артыкул тав. Васілевіча «КП(б)Б у барацьбе за бальшавіцкую лінію» і артыкул тав. Сянкевіча, зьмешчаныя ў «Правде», знайшлі водгук на старонках органу віленскіх манархістых — «Слова».

Гэты водгук прадстаўляе пэўную цікавасьць, бо ён лішні раз падкрэсьлівае, як цесна сплецены, зьвязаны контр-рэвалюцыйныя сілы БССР з польскім фашызмам.

Нам ужо ня раз прыходзілася адзначаць, што польскі імпэрыялізм у сваіх контр - рэвалюцыйных ваенных плянах ставіць таксама стаўку і на капіталістычныя элементы гораду і вёскі нашага савецкага краю. Польскі фашызм і яго верны саюзьнік — заходня - беларускі нацыянал - фашызм у сваіх імкненьнях арганізаваць і падрыхтаваць ваенны паход супроць БССР і УССР, у сваіх імкненьнях нератварыць іх у калёніі польскага капіталу — **ставіць стаўку** на кулака, нэпмана, контр - рэвалюцыйнага нацыянал - дэмакрата розных масьцей.

Палітычныя правадыры польскага фашызму і заходня - беларускага нацыянал - фашызму прабалбатваюць свае надзеі на контр - рэвалюцыйныя сілы, супроць якіх вядзе жорсткую барацьбу пралетарская дыктатура. Цяпер, калі мы са ўсёй бальшавіцкай рашучасьцю, настойлівасьцю і пасьлядоўнасьцю ажыцьцяўляем палітыку ліквідацыі кулацтва, як клясы, на базе суцэльнай калектывізацыі, калі мы ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы праводзім ігіанцкую работу па сацыялістычнай рэканструкцыі вёскі, калі Савецкая Беларусь пры нячуваным творчым энтузіязьме шырокіх працоўных мас расьце і мацнее, іменна цяпер з асаблівай злосьцю накідаюцца нашы ворагі на Савецкі Саюз.

Змаганьне, якое вядуць з кулацтвам шырокія масы бядняцка - серадняцкага сялянства пад кіраўніцтвам пралетарыяту і яго Камуністычнай партыі, аніраецца замежнымі пісакамі, як змаганьне супроць «усяго сялянства». Наша змаганьне з нацыянал - дэмакратызмам —малюецца як змаганьне супроць «усяго беларускага нацыянальна - культурнага будаўніцтва». Наша змаганьне супроць польскага і яўрэйскага навізмаў выказваецца як змаганьне супроць «усяго польскага і яўрэйскага васьсьліцтва». Віленскае «Слова» падрабязна займаецца «разглядам» і «аналізам» артыкулаў т. т. Васілевіча і Сянкевіча і крычаць аб «трагэдыі», якую, нібы, перажываюць «беларускія землі на савецкі бок мяжы». Гэта «трагэдыя» ў вуснах крывавых акупантаў і душыцеляў рэвалюцыйна - вызваленчага змаганьня пматмільённых працоўных мас Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, выяўляецца як, літаральна заяўляе «Слова», у тым, што мы ажыцьцяўляем

«антыкулацкую палітыку, падатковыя рэпрэсіі і ўрэшце калектывізацыю сельскіх гаспадарак».

Зусім відавочна, што наша палітыка выбівае апошнюю надзею і апошнюю сацыяльную апору ў іх, тут, у БССР. Зусім відавочна, што добраахвотны рух шырокіх бядняцка - серадняцкіх мас сялянства ў калгасы — выклікае шаленства з боку нашых ворагаў. Адгэтуль —крыкі аб «трагэдыі», адгэтуль енкі аб «прасьледваньях усіх сялян». І зразумела, чаму артыкул тав. Васілевіча, які разгарнуў малюнак вялікага сацыялістычнага будаўніцтва, што адбываецца ў БССР, нашага ўзмоцненага наступленьня на капіталістычныя элементы гораду і вёскі, нашых бязумоўных посьпехаў, якія гавораць аб навароце вёскі да сацыялізму, выклікае ў нашых самых заклятых ворагаў параксізм шаленства і гістэрыі ў абарону... кулака і нацыянал-дэмакрата.

Асабліва многа месца аддае «Слова» пытаньням аб «беларускай інтэлігенцыі», дакладней — аб беларускім нацыянал - дэмакратызьме, аб **буржуазнай частцы** інтэлігенцыі. У артыкулах т. Васілевіча і Сянкевіча, зьмешчаных у «Правде», дасцца, між іншым, аналіз таго змаганьня, якое правяла і вядзе наша партыя з нацыянал - дэмакратызмам, посьпехаў, якія намі дасягнуты ў гэтым змаганьні, і далейшых задачах, якія стаяць перад партыяй. Гэту частку артыкулаў віленскае «Слова» бярэ пад шалёны абстрэл сваіх «разважаньняў» на тэму аб нацыянальнай палітыцы нашай партыі. «Слова» піша:

«Нядаўна ў маскоўскай «Правде» зьявіўся цікавы артыкул, які прысьвечаны барацьбе з так званым беларускім нацыянал - дэмакратызмам. Ніхто іншы, як сама «Правда» піша, што сёньняшняя Беларусь знаходзіцца ў нэрвыдзе абвостранага клясавага змаганьня на двух франтох: ідэалёгічным і нацыянальна-культурным»...

Абвастрэньне клясавага змаганьня віленскія фашысцкія журналістыя малююць, зразумела, на свой лад. Нацыянал - дэмакраты зусім адкрыта абвяшчаюцца «Словам» як яго верныя саюзьнікі ў змаганьні з дыктатурай пралетарыяту, у змаганьні з сацыялістычным будаўніцтвам. «Слова» піша аб тым, што

«Беларуская інтэлігенцыя... пачынае абурацца супроць дыктатуры маскоўскага чырвонага пралетарыяту сьведчыць хаці-б той факт, што савецкі друк ня можа далей цярпець гэта і выступае да адкрытай барацьбы».

Аб якім «бунце» гавораць фашыстыя? Шырокія масы беларускай працоўнай інтэлігенцыі ідуць за нашай партыяй. Буржуазная частка інтэлігенцыі — ідэолёгі кулацтва супрацьўляюцца нашаму рэгарнутаму наступленьню. Супроць нацыянал - дэмакратаў пад кіраўніцтвам нашай партыі выступаюць шырокія масы працоўных. Разьвіцьцё сацыялістычнага будаўніцтва — гэта магутныя ўдары па клясавым ворагу нашага краю і на клясавым ворагу там, за межамі. Наша пяцігодка, разгортваньне калектывізацыі, узрост і разьвіцьцё нацыянальна - культурнага будаўніцтва, гаспадарча - культурны росквіт нацыянальных рэспублік — усё гэта іскры рэвалюцыйных уплываў, якія падаюць у краі капіталу і выклікаюць з боку працоўных узрост сымпатый да Савецкага Саюзу, з боку буржуазіі і ее агентаў— клясавую нянавісьць і ўзмацненьне падрыхтоўкі вайны супроць краю савецкаў. І зразумела чаму, закранаючы артыкулы, зьмешчаныя ў «Правде», віленскае «Слова» піша:

«З моманту ўмацаваньня бальшавіцкай улады на беларускіх землях —нацыянальна - беларуская ідэалёгія перайшла да наступленьня і зацята змагаецца з кожнай правяй прагрэсуючай камуністычнай сыстэмы».

Як мы ўжо адзначалі вышэй, ажыцьцяўленьне нашай палітыкі ліквідацыі кулацтва, як клясы, на базе суцэльнай калектывізацыі, посьпехі ў галіне сацыялістычнай рэканструкцыі вёскі, што «Словам» называецца як «прагрэс камуністычнай сыстэмы» выклікала асабліва ўзмоцненую кампанію супроць Савецкага Саюзу.

Наша партыя, пад кіраўніцтвам свайго ЦК, з посьпехам змагаласі і граміла прышчэпаўскую праваапартуністычную лінію Наркамзему. Партыя нанесла прышчэпаўскай палітыцы ў Наркамземе руйнуючы ўдар. Партыя бачыла і бачыць у прышчэпаўшчыне, яскравае выяўленьне на практыцы праваапартуністычных тэорый аб мірным урастаньні кулака ў сацыялізм, аб испарыўных уступках капіталістычным элементам, практыку і тэорыю, якія вядуць да капіталістычнай рэстаўрацыі. Камэнтуючы тую частку артыкулу, які гаворыць аб змаганьні партыі з прышчэпаўшчынай, віленскае «Слова» адкрыта робіць Прышчэпаца сваім гэроям. «Слова» заяўляе:

«Савецкі ўрад навольна, але сыстэматычна ліквідуе нацыянальна-беларускія тэндэнцыі ў Менску. Пад першы агонь падпаў найбольш небясьпечны Наркамзем Прышчэпаў, які сваёй зямельнай палітыкай падтрымліваў кулацтва, фактычна апіраючыся на здаровыя элементы краю».

Зразумела, чаму прышчэпаўская палітыка, палітыка кулацкая, палітыка, якая вяла да ўмацаваньня капіталістычных элементаў у сельскай гаспадарцы, яўна ўхваляецца нашым в Польскі фашызм праліваe сьл прышчэпаўскай палітыцы ў Нар ме, якая, бачыце, апіралася «на выя элемэнты краю». «Здаровы мэнты» — гэта кулак, гэта конт люцыйны нацыянал - дэмакрат, г асноўная сіла, на якую апіраецца кнецца апірацца польскі фаш сваіх антысавецкіх плянах.

«Слова» адразу-ж пасьпяшалас гукнуцца на дыскусію па пыта мовазнаўства, аб характары якой лі ў сваіх артыкулах тав. Васіл Сянкевіч. «Слова» з захапленьне ворыць:

«Найбольш правяў сябе бе кі сэпаратыстычны рух у дз на пытаньнях мовазнаўства. рускія сучоныя, непасрэдна не заныя на гэтай дыскусіі, вы выразную антымаскоўскую т цыю. Яны абвясьцілі барацьбу народным пачаткам у белар мове. Што, аднак, найбольш пула бальшавікоў, гэта факт пры ўстанаўленьні спрэчных схіляліся заўсёды да польскае вы гэтых слоў. Замена, напры ужываная ў Саветах слова «эк атацыя» словам «выяск». Пры «Правда» лічыла патрэбным с напомніць аб культуры Захаду.

Няма патрэбы гаварыць аб т якой нянавісьцю прабуюць апле нашу партыю, нашу клясавую палі ў акадэмі навук ворагі з-за кар выя элемэнты краю». «Здаровы мэнты» — гэта кулак, гэта конт люцыйны нацыянал - дэмакрат, г асноўная сіла, на якую апіраецца кнецца апірацца польскі фаш сваіх антысавецкіх плянах.

«Слова» адразу-ж пасьпяшалас гукнуцца на дыскусію па пыта мовазнаўства, аб характары якой лі ў сваіх артыкулах тав. Васіл Сянкевіч. «Слова» з захапленьне ворыць:

«Найбольш правяў сябе бе кі сэпаратыстычны рух у дз на пытаньнях мовазнаўства. рускія сучоныя, непасрэдна не заныя на гэтай дыскусіі, вы выразную антымаскоўскую т цыю. Яны абвясьцілі барацьбу народным пачаткам у белар мове. Што, аднак, найбольш пула бальшавікоў, гэта факт пры ўстанаўленьні спрэчных схіляліся заўсёды да польскае вы гэтых слоў. Замена, напры ужываная ў Саветах слова «эк атацыя» словам «выяск». Пры «Правда» лічыла патрэбным с напомніць аб культуры Захаду.

Няма патрэбы гаварыць аб т якой нянавісьцю прабуюць апле нашу партыю, нашу клясавую палі ў акадэмі навук ворагі з-за кар Адкрытыя водгукі «Слова» на «вы навуковую» дыскусію адразу-ж кід яркае палітычнае сьвятло на гэту кусію. Той невыпадковы факт, «Слова» бярэ пад сваю абарону на пан - дэмакратычных «вучоных» у таньнях і мовазнаўства, сьведч яшчэ раз аб рэакцыйным,антысавет характары «навуковай» вылазкі на налістых.

Усякае выступленьне нацыянал макратаў супроць нашай палітыкі хапляецца буржуазнай прэсай і р дзьмухваецца да нязвычайных раз раў. У гэтым няма нічога дзіўнага! пая змычка клясавых сіл, варожых і вядучых супроць нас змаганьне п жыцьцё, а на сьмерць. І чым больш сьпяхова растуць сілы сацыялізму, хутчэй разгортваецца справа індуст ялізацыі нашага краю і калектывіза сельскае гаспадаркі, тым усё больш лёнымі становішча супрацьўленьне савага ворага ўнутры нашага краю тым большай актыўнасьцю клясавы раг за межамі рыхтуе паход супр нас.

Але водгукі ворагаў яшчэ раз га рацъ аб характары і палітычным аб чы нацыяналізмаў усіх масьцей. П крэсьліваем—**іменна ўсіх масьцей, «Слова» ў** гэтым-жа артыкуле чульл бярэ пад сваю абарону і яўрэйскіх польскіх, і расійскіх шавіністых і цыяналістых. Зусім ня двузна гучыць заключны акорд контр-рэ люцыйных разважаньняў віленскіх п судчыкаў. Яны мараць аб

«злучэньні неарганізаваных сил скіх мас з актыўнай беларускай ін лігенцыяй — у адзін антысавет беларускі лягер».

Гэтыя пляны аб адзіным антысавет кім лягеры кулацка-нацыяналістычн сіл нашага краю — гэта пляны пол ская імпэрыялізму аб злучэньні ус клясава-варожых нам элемэнтаў д барацьбы супроць БССР, для зрыву с цыялістычнага будаўніцтва, для падры тоўкі антысавецкай вайны.

Але з тым большай сілай, з тым бол шай энэргіяй наша партыя, мабілізуюч вакол сябе найшырэйшыя масы работ клясы, бядняцка-серадняцкага сялян ства і працоўнай інтэлігенцыі, буд весьці рашучае змаганьне супроць кл савага ворага на ўсіх вучастках сацы лістычнага будаўніцтва, будзе змагац з нацыяналізмамі ўсіх масьцей, буд ажыцьцяўляць палітыку ліквідацы кулацтва, як клясы, на аснове суцэльнай калектывізацыі.

Няма сілы, якая магла-б спыніць гэты наш пераможны рух наперад да сацыялізму!

С.

„ЧЫРВОНЫЯ ПЕРАКРОЙВАЮЦЬ КАРТУ КІТАЯ"

КАМУНІСТЫЧНЫЯ АТРАДЫ КАЛЯ ВАРОТ ЧАНША

З мінуты на мінуту

ЛЁНДАН, 4. Камуністычныя часьці, якія дзейнічаюць на поўдні і захадзе ад Чанша нанесьлі паражэньне нанкінскім войскам. ЗАНЯЦЬЦЕ ЧАНША КАМУНІСТЫЧНЫМІ ЧАСЬЦЯМІ ЧАКАЕЦЦА З МІНУТЫ НА МІНУТУ.

Камандуючы ангельскімі морскімі сіламі ў Кітаі выехаў з Шанхаю на ваенным судне «Б-і» для абсьледваньня становішча ў Чанша. (ТАСС).

МЫШЫ З КАРАБЛЯ

ШАНХАЙ, 5. Замежныя рэзыдэнты пакідаюць Чанша (правінцыя Хунань). У горад прыбыў ангельскі зьнішчыцель. З прычыны набліжэньня вайскэвых дзеяньняў, кітайскае і замежнае насельніцтва Цзінані (правінцыі Хуандунь) знаходзіцца ў паніцы. (ТАСС).

НА БАРАЦЬБУ СА ЗДАНЬНЮ КАМУНІЗМУ—ВАЙСКОВЫЯ СУДНЫ І ЗЬНІШЧЫЦЕЛІ

ШАНХАЙ, 4. Улады правінцыі Хубэй паслалі вайсковыя судны супроць агралаў Чырвонай арміі Мо Дэ-гуя, якія апэруюць у гэтай правінцыі. Акрамя таго, у раёны на мяжы правінцый Хубэй і Цзянсі пасланы зьнішчыцелі для барацьбы з атрадамі паўстанцаў.

ЛЁНДАН, 4. Як паведамляюць з Пэйпіна, амэрыканская кананэрская лодка, якая знаходзіцца на рацэ Янцзы-Цьзян атрымала загад неадкладна накіравацца ў Цьзю-Цьзян (буйны цэнтр правінцыі Янцзы) у сувязі з нагрозай гораду з боку атрадаў камуністых, якія паблізіцца.

ВЫБУХ У НАНКІНСКІМ АРСЭНАЛЕ

ШАНХАЙ, 4. У мясцовым арсэнале нанкінскага ўраду здарыўся моцны выбух. Налічваецца многа ахвяр. Страты вялізарныя.

РЫНАК ЗУСІМ ДЭМАРАЛІЗАВАНЫ

ПЭЙПІН, 3. З Шанхаю падаюць, што рынак зусім дэмаралізаваны. За амэрыканскі доляр сёньня плацілі 20 кітайскіх долярaў. Значнае зьніжэньне цэн не серабро выклікала панічныя настроі ў дзелавых колах Шанхая. Апошнімі днямі збанкрутавалі пяць буйных кітайскіх банкаў. Рад замежных фірмаў стаіць напярэдадні банкрутства. (ТАСС).

КАРТА КІТАЮ ЗНОЎ МЯНЯЕЦЦА

ПЭЙПІН, 3. Газэта «Норд Чайна Дэйлі Мэйль» у сувязі з апошнімі падзеямі ў Кітаі піша: **«Карта Кітаю зноў мяняецца.** Мангчжурыя ў руках Чжан Сюэляна, Поўнач Кітаю ў руках Ен Сі-шана і Фынь Ю-сяна, у той час, як Нанкін зьяўляецца сталіцай. **Уканская акруга напэўна стане месцам знаходжаньня чырвоных.** Чан Кай-шы са сваёй клікай стварылі ў краі ўсеагульны хаос і замяшаньне. Будучае Кітаю вельмі сумнае. **Становішча Кітайскай рэспублікі, відавочна, безнадзейна».** (ТАСС).

ПРЫХІЛЬНІКІ НАНКІНА ЗАНЕПАКОЕНЫ

ШАНХАЙ, 5. Нават бліжэйшыя прыяцелі і прыхільнікі нанкінскага ўраду сур'ёзна непакояцца за яго лёс. Са ўсіх франтоў наступаюць трывожныя весткі аб тым, што нанкінскае войска пакінула Чанша (цэнтр правінцыі Хунань), у які ўступаюць войскі Чана-Гуя. Побач з пяўдачамі на франтох фарсаваным тэмпам разгортваецца эканамічны крызіс, з якога Нанкін ня ў стане выйсьці. Яшчэ закрываюцца фабрыкі. Вялізарныя вучасткі зямлі зусім не апрацоўваюцца. Валюта і акцыі вельмі падаюць. Многія буйныя фірмы блізкі да банкрутства. Ня спыняецца наступленьне чырвоных часьцей. Ніколі раней становішча нанкінскага ўраду ня было такім хісткім.

Дэманстрацыі беспрацоўных у Вільні

ВІЛЬНЯ, 5. Учора ў Вільні адбылася дэманстрацыя беспрацоўных перад будынкам ваяводзтва. Гэтая дэманстрацыя выклікана новым скарачэньнем ліку працуючых на публічных работах.

СЭНАТАРЫ ПАТРАБУЮЦЬ СКЛІКАНЬНЯ СЭНАТУ

ВАРШАВА, 4. 38 сэнатараў падалі прэзыдэнту рэспублікі заяву з патрабаваньнем склікаць надзвычайную сэсію сэнату.

Камсамольскія праклямацыі

ВІЛЬНЯ, 5. У часе маніфэстацыі яўрэйскай сацыял-фашысцкай юнацкай арганізацыі «Цукунфт» камуністычная моладзь раскідала праклямацыі. Арыштавана некалькі маладых рабочых, западозраных у гэтым.

ПРАЦЭС БЫЛЫХ ВУЧНЯЎ ВІЛЕНСКАЙ БЕЛАРУСКАЙ ГІМНАЗІІ

ВІЛЬНЯ, 5. Гэтымі днямі ў Віленскім акруговым судзе адбыўся працэс двух вучняў Беларускай Гімназіі Яна Жыткевіча і Барыса Махляра, якія былі выключаны беларускімі нацыянал-фашыстымі за рэвалюцыйныя настроі.

Яны абвінавачваюцца ў прыналежнасьці да КПЗБ. Вілекскі суд прысудзіў кожнага да 6-ці год катаржнага зьняволеньня.

Абвінавачаньня пасьля прачытаньня прыгавору некалькі разоў выклікнулі: «Прэч з фашысцкім судом». За гэта яны прыцягваюцца паўторна да судовай адказнасьці.

У КСЯНДЗА УСАСА ПАЎТАРАЮЦЦА «НЕПАРАЗУМЕНЬНІ»

ВАРШАВА, 4. «Кур'ер Чырвоны» паведамляе, што ў адным з самых вялікіх варшаўскіх касьцёлаў некая жанчына ў час споведзі абліла атрамантам ксяндза Усаса.

Усас вядомы СССР. Некалькі год таму назад ён быў арыштаваны ў Ленінградзе на скарзе некалькіх жанчын, якія абвінавачвалі яго ў катаваньні іх на глебе палавой паталёгіі. Польская прэса, якая ўзяла пад абарону ксяндза Уласа, малявала яго, як ахвяру «бязбожных бальшавікоў». Усас быў выдалены польскім урадам і вярнуўся ў Варшаву. Відавочна, у гэтага «мучаніка» такі ўжо лёс, што ў яго і ў Польшчы паўтараюцца «непарэзуменьні». (ТАСС).

Новая пазыка

У бліжэйшым часе на мясцох пачнецца фактычная работа на разьмяшчэньні пазыкі «Пяцігодка — у чатыры гады». Нашы дзяржаўныя пазыкі сталі магутнай крыніцай індустрыялізуючай краіну. Пры дапамозе пазык кожны год дадаткова адпускаюцца сотні тысяч руб. на **капітальнае будаўніцтва.**

Выпускаемая паводле пачыну шырокіх мас рабочых пазыка «Пяцігодка — у чатыры гады» набывае, аднак, асаблівае значэньне. **Новая пазыка,** на аблігацыі якой будуць абменены аблігацыі 1-е, 2-е пазык індустрыялізацыі і пазыкі ўзмацненьня сялянскае гаспадаркі, **разьлічана на разьмяшчэньне ў працягу раду год.** Пазыка «Пяцігодка — у чатыры гады» выпускаецца на тых-жа ўмовах, што і трэцяя пазыка індустрыялізацыі. Таму, як тлумачыць сёньня Наркамфін Саюзу, 3-я пазыка індустрыялізацыі застаецца ў звароце.

Новая пазыка «Пяцігодка — у чатыры гады» забясьпечвае яго трымальнікам максымальныя ільготы. Кожны падпісчык, набываючы аблігацыі новае пазыкі, ня траціць і ўсіх ільгот, прадастаўленых на тыражох пазыкамі індустрыялізацыі. Сама тэхніка абмену на аблігацыі новае пазыкі выключае магчымасьць якіх-бы ні было нявыгод, або няправільнасьцяй.

Мы ніколі ня ўяўлялі пасьпяховага разьмяшчэньня пазык без актыўнага сапраўднага ўдзелу ў гэтым саміх працоўных. Надпіска на пазыкі індустрыялізацыі зусім добраахвотная, бяз якога-б ні было прымусу. І калі кожны раз пасьля выпуску пазыкі ад фабрык і заводаў паступалі заяўкі, **якія перавышаюць разьмеры самой пазыкі,** гэта сьведчыла аб высокай сьвядомасьці рабочае клясы, усіх працоўных, сваімі асабістымі зьберажэньнямі, якія дапамагаюць пралетарскай дзяржаве

УСЕСАЮЗНЫ АБМЕН ВОПЫТАМ БАРАЦЬБЫ ЗА ЛІНІЮ ПАРТЫІ

Беларускія фабрыкі, заводы, калгасы расказваюць:

КАМУНА ІМЯ СТАЛІНА—пасеўная плошча пашырана на 13 проц. Колькасьць членаў камуны вырасла ў 10 раз. Нормы выпрацоўкі павышаны на 25 проц. Ідзе будаўніцтва на суму ў 500.000 руб.

ФАБРЫКА „БЕЛАРУСКА"—рабочыя выканалі абяцаньне XIII зьезду:—у маі—102 проц. праграмы.

АКУЛЯРНАЯ ФАБРЫКА—пераклічка паміж цэхамі, брыгадамі, ударнікамі. У красавіку—113 проц., у маі—111 проц.

РАБОЧЫЯ, КАЛГАСЬНІКІ БССР! Памятайце аб закліку Маскоўскага заводу „Динамо". Давайце да XVI зьезду партыі справаздачу аб сваёй баявой рабоце.

Прарывы 8-мі месяцаў ліквідуем у ліпені

Рапарт XIII зьезду КП(б)Б ад рабочых і адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу заводу «Пралетары»

XIII-му зьезду КП(б)Б шлюць сваё шчырае пралетарскае прывітаньне рабочы калектыў і адміністрацыйна-тэхнічны пэрсанал Гомельскага машынабудаўнічага заводу «Пралетары».

Наш завод заўсёды быў і будзе моцнай цытаделяй нашай партыі ў барацьбе за ленінскае адзінства, супроць усіх ыцікаў, малаверaў, апартуністых, якія сваім крыклівым піскам хочуць насеяць сумненьне ў рабочай масе да генэральнай лініі нашай партыі.

Мы глыбока ўпэўнены ў правільнасьці і актыўна дапамагаем ажыцьцяўленьню генэральнай лініі нашай партыі, накіраванай да пераўтварэньня нашай краіны зямляробчай у краіну машыны аўтамобіляў і трактараў, да забесьпячэньня эканамічнай самастойнасьці ад капіталістычных краін, да абароназдольнасьці нашай краіны, да сацыялістычнай перабудовы сельскае гаспадаркі, да ліквідацыі кулацтва, як класу, на базе суцэльнай калектывізацыі, да набудовы сацыялізму ў нашай краіне.

Рабочыя заводу «Пралетары» непадзельна даручаюць кіраўніцтва сваёй партыі і сваім творчым энтузіязмам забясьпечваюць пераможнае сацыялістычнае будаўніцтва.

На нашым заводзе глыбока ўкараняецца сацыялістычныя формы арганізацыі працы. Ударны рух набыў масавы характар, ахапіўшы амаль, увесь завод.

Ударніцкі рух пераходзіць у вышэйшую ступень. У нас на заводзе, яшчэ ў сакавіку месяцы кацельны цэх, у колькасьці чал., абвясьціў сябе камуністычным. Ён на справе апраўдаў сваю назву, перакананаючы прамфінплян. Цяпер мэханічны цэх, у колькасьці 300 чалавек, які выканаў прамфінплян у маі месяцы на 109,6 проц., абвясьціў сябе камуністычным імя XVI-га зьезду УсеКП(б)

У нас на заводзе прайшла самаправерка сацыялістычнага спаборніцтва і па сваіх цэхавых сходах рабочыя выяўлялі ілжэ-ўдарнікаў, прагульшчыкаў, заносячы іх на чорную дошку, адначасова мы выявілі і лепшых ударнікаў, ударныя брыгады, якія праявілі свае прыкладныя адносіны да вытворчасьці, заносячы іх на чырвоную дошку.

У першым паўгодзьдзі бягучага гаспадарчага году завод значна павялічыў сваю выпрацоўку. Намі за першае паўгодзьдзе **мінулага году** было выпушчана прадукцыі на 764.000 руб. У першым паўгодзьдзі **гэтага году** намі выпушчана прадукцыі на 1.511.000 руб., ці **на 98,1 проц. больш.** Прадукцыйнасьць працы ў параўнаньні з першым паўгодзьдзем мінулага году ўзрасла на 45,1 проц

Ня глядзячы на такі рост выпрацоўкі, мы ў першым паўгодзьдзі гэтага году **недавыканалі вытворчага заданьня.** У першым квартале праграма намі выканана ўсяго на 83,2 проц. У другім квартале наш завод выканаў колькасныя заданьні прамфінпляну на 102,5 проц. Усяго за першае паўгодзьдзе плян выкананы на 93,2 проц.

З кожным месяцам завод павялічвае выпуск прадукцыі. За 8 месяцаў вытворчае заданьне намі выканана ўжо на 94 проц. Пры гэтым усе цэхі перавыканалі заданьне, за выключэньнем арматурнага цэху, які недавыканаў свайго заданьня за 8 месяцаў на 22 проц. Але ўжо ў маі месяцы і ў арматурным цэху маюцца значныя зрухі: калі ў красавіку месяцы цэх выканаў заданьне на 55,5 проц., то ў маі праграма выканана на 82,2 проц.

Мы маем вялікі прарыў і па якасных нага зьніжэньня сабекошту на 16,5 паказальніках пляну. Замест намечанага проц., намі зьніжана толькі на 10 проц. Яшчэ вельмі высокі процант браку, нізкія якасьць прадукцыі. Ня зьніжаны поўнасьцю прагулы, спазьненьні і інш. парушэньні працоўнай дысцыпліны. Дырэктывы партыі аб адзінаначальні яшчэ не асвоены ўсімі рабочымі і недастаткова праводзяцца ў жыцьцё адміністрацыяй заводу.

Няпоўнасьцю выкарыстоўваюцца прапановы рабочых. Рабочыя на аснове свайго практычнага вопыту ўнесьлі ў мінулым годзе 142 прапановы, якія павінны былі даць каля 120.000 руб. эканоміі. **Аднак, з гэтых прапаноў выкананa толькі 35.**

У часе самаправеркі сацыялістычнага спаборніцтва рабочымі ўнесена **яшчэ каля 200 прапаноў.** Поўнае і найхутчэйшае выкананьне гэтых прапаноў, бязумоўна, забясьпечыць 100-процантнае выкананьне ўсіх колькасных і якасных паказальнікаў пляну.

Энтузіязм рабочых усяго заводу, шырока разгорнутае сацыялістычнае спаборніцтва, ахапіўшае больш 90 проц. усяго складу рабочых заводу, арганізацыя камуністычных цэхаў гарантуе, што прамфінплян будзе ня толькі выкананы, але і перавыкананы. Для гэтага неабходна, каб кіраўніцтва заводу ўмела скарыстоўвала энтузіязм і ініцыятыву рабочых і накіравала іх на выкананьне ўсіх колькасных і якасных паказальнікаў прамфінпляну.

Рабочы калектыў заводу «Пралетары» дае сваё абяцаньне XIII-му зьезду КП(б)Б, што ён у лініі над кіраўніцтвам заводзкіх арганізацый **ліквідуе прарыў у выкананьні прамфінпляну і забясьпечыць перавыкананьне прамфінпляну да канца гаспадарчага году.**

Нахай жыве Камуністычная партыя Беларусі—кіраўнік рабочае клясы БССР!

Нахай жыве Ленінскі ЦК УсеКП(б) і КП(б)Б!

Пяцігодку—за чатыры гады!

Рабочыя і адміністрацыйна-тэхнічны пэрсанал.

Да канца сяўбы засталіся лічаныя дні

Плян па усіх культурах выканан толькі на 75%

Усе сілы і сродкі—на сваячасовае і поўнае выкананьне пляну

Аб чым гавораць лічбы

Паводле вестак Наркамзему на 30 мая па БССР засеяна 1.740.247 гэкт., што складае 74,6% агульнага пасеўнага пляну. Калгасамі засеяна 332.631,4 гэкт., або 78,7% свайго пляну, індывідуальным сэктарам — 1.407.615,5 гэкт. — 73,8 проц.

Гэтыя лічбы сьведчаць, што ход сяўбы як у калгасах, так і ў індывідуальным сэктары не забясьпечвае сваячасовага выкананьня пасеўнага пляну. Да канца сяўбы засталося яшчэ 6-7 дзён, а плян недавыкананы яшчэ на 25%.

На асобных культурах малюнак такі: па збожжавых культурах калгасы выканалі — 87,4% пляну, індыв. сэктар — 75,2%; па ільне: калгасы — 46%, індыв. сэктар — 57,7%; па канаплях: калгасы — 25,8%, індыв. сэктар — 26,5%; па бульбе: калгасы — 71,2%, індыв. сэктар—89,1%; па аднагадовых травах (віцы і сэрадэлі): калгасы—79,2%, індывідуальны сэктар — 61,7%; па капюшыне: калгасы — 91,4%, індыв. сэктар — 68,5% і па іншых культурах: калгасы—57,7%, індыв. сэкт.—52%.

У сярэднім па абодвых сэктарах плян выкананы: па збожжавых культурах — на 77,3%, ільне — на 55,8%, канаплях — на 26,4%, бульбе — на 86%, аднагадовых травах — на 65,6%, капюшне — на 75,7% і іншых культурах — на 53,1%.

Як відаць з гэтых лічбаў, асабліва дрэнна ідзе сяўба ільну, канапель і іншых культур. На асобных акругах процант выкананьня пляну па гэтых культурах зусім мізэрны. Так па Полацкай ільнаводнай акрузе плян па ільне выкананы — на 23,8%, па Віцебскай акрузе — на 39,4%, па Менскай акрузе — на 48,6%. На канаплях плян выкананы на Віцебскай акрузе —на 20%, Аршанскай акрузе—на 13,3%, Магілеўскай — на 9,2%.

Па Полацкай акрузе плян сяўбы выкананы калгасамі — на 81,8%, індыв. сэктарам — на 59,7%, у сярэднім па абодвух сэктарах—на 64,3%. Па Віцебскай акрузе: калгасамі — на 81,2%, індыв. сэктарам — на 68,1%, у сярэднім — на 70%. Па Аршанскай акрузе: калгасамі — 71,5%, індывідуальным сэктарам—на 74,2%, у сярэднім — на 73,8%. Па Менскай акрузе: калгасамі — на 82,4%, індыв. сэктарам — на 71,6%, у сярэднім — на 74%. Па Магілеўскай акрузе: калгасамі — на 72,6%, індыв. сэктарам—73,2%, у сярэднім — на 73,1%. Па Бабруйскай акрузе: калгасамі — на 76,3%, індыв. сэктарам — на 77,4%, у сярэднім—на 77,2%. Па Мазырскай акрузе: калгасамі—на 76,2%, індыв. сэктарам—на 73,9%, у сярэднім — на 74,3%. Па Гомельскай акрузе: калгасамі — на 87,7%, індыв. сэктарам — на 87,7%, у сярэднім — на 87,7%.

Мазырская акруга першай выступіла ў поле. Між тым, яна значна адстала ад іншых паваг паўднёвых акруг. За апошнюю пяцідзёўку процант засеянай плошчы па Мазырскай акрузе павысіўся зусім нязначна (з 67,7% да 74,3%). Бабруйская акруга таксама адстае.

Мясцовыя арганізацыі павінны прыняць самыя рашучыя меры для фарсаваньня тэмпаў сяўбы з тым, каб забясьпечыць сваячасовае 100-процантнае выкананьне пасеўнага пляну.

Мабілізаваць усе сілы

ТЭЛЕГРАМА НАРКАМЗЕМУ БССР тав. РАЧЫЦКАГА

Усім Акрза

Даныя аб ходзе сяўбы на 30-е мая канстатуюць нагрозу недавыкананьня пляну сяўбы амаль што па ўсіх культурах. У цэлым, па БССР выкананa 75 проц. пляну. Выкананьне застаўшыхся 25 проц. за кароткі час патрабуе яшчэ большай напружанасьці сіл і ўвагі, чым першыя 75 проц. Катэгарычна прапаную мабілізаваць усе сілы, сродкі і ўвагу на забясьпячэньне поўнага выкананьня пасеўнага пляну ня ўсіх культурах, але прынятых мерах і аб выніках тэлеграфуйце па пяцідзёнках.

Упоўнаважаны пасеўнай кампаніі па БССР РАЧЫЦКІ.

Ці апраўдаем імя правадыра

Вопыт работы і барацьбы камуны імя Сталіна

Камуна імя Сталіна (Парыцкі раён, Бабруйскай акругі) арганізавалася ў верасьні 1929 году. 11 батрацка-бядняцкіх сем'яў прышлі ў чыстае поле, без інвэнтару, цягавай сілы. Ня было ніякіх будынкаў. 6 кароў, 2 плугі, 3 калёс—вось і ўся маемасьць сталінцаў.

— Цяжкою і доўгаю была для нас восень—1929 г.—апавядаюць камунары. Да глыбокай зімы жылі ў хлявох і галадалі.

Але камунараў не спалохалі вялікія труднасьці. Не спалохалі іх і кулакі.

Упартасьць і настойлівасьць маленькай жменькі людзей перамагалі з кожным днём. Камунары паставілі сабе цьвёрдую мэту—апраўдаць назву камуны—імя правадыра ленінскай партыі бальшавікоў. Яны парушылі дзейнічаць наказам. Працавалі дні і ночы. Будуюцца дамы, аборы, стайні для коняй. Набываецца 10 коняй, калёсы, сельска-гаспадарчы інвэнтар.

Толькі дзевяць месяцаў працуе камуна. Маленькі тэрмін, але шмат пройдзена.

Вясною гэтага году камунарамі закончана набудова чатырох дамоў, дзе жыве 26 сем'яў. Набудаваны двор для рагатай жывёлы, больш як на 100 штук, сьвінарнік на 200 штук, аборы для коняй на 50 штук, выкананa свая студня. Сялянне сталі прыглядвацца да камуны. Многія з іх перакананаюцца ў тым, што калгас — сапраўдны шлях да новага, лепшага жыцьця.

Ліквідацыя няпісьменнасьці ў камуна «Луч Сацыялізму» Самакв. раёну.

Узор для каўкольнага сялянства

Ужо ў гэту вясну, у той час, як апартуністы і ворагі пралетарыяту кракалі аб правале сацыялістычнага будаўніцтва на вёсцы (у сакавіку і красавіку) **колькасьць членаў камуны павялічваецца ў дзесяць раз.** Упартая работа на гаспадарчым будаўніцтве камуны, удалы пробны выезд камунараў на поле зьявіўся сапраўдным узорам бальшавіцкай работы. Камуна імя Сталіна становіцца ўзорам для сялянства ўсяго Парыцкага раёну. Аб ёй ведае сялянства ўсёй Бабруйскай акругі.

Цяпер у камуне імя Сталіна налічваецца 98 гаспадарак, з якіх: 45 батрацкіх, што ўсё жыцьцё працавалі ў абшарнікаў і кулакоў, 33 бядняцкіх, 6 серадняцкіх і 14 служачых. Усе служачыя кінулі сваю ранейшую работу і выконваюць зараз фізычную работу, як і іншыя камунары. Тэрыторыя камуны за гэту вясну павялічылася больш як у 5 раз. Плошча камуны складае 1.120 гэкт., з якіх амаль палова—520 гэкт. пахаці, 480 гэкт. сенажаці, а рэшта—выпасы.

Маемасьць камуны павялічылася ў некалькі дзесяткаў раз. Ёсьць 67 рабочых коняй, 150 дойных кароў, 126 штук цялят маладняка, 240 дарослых сьвіней, з якіх 40 матак, 3 кнуры; 45 калёс, 32 плугі, сартыроўка, 5 малатарань, касілкі, сівяркі і інш.

Першы вопыт

Веснавая сяўба ў камуне імя Сталіна прайшла па-бальшавіцку. Грамадзкасьці ўжо вядомы першы ў Беларусі вопыт сталінцаў па арганізацыі працы ў камуне імя Сталіна. Усе рабочыя—136 чалавек—разьбіты на 6 брыгад. Паляводчая брыгада—48 чалавек — падзяляецца на групы: сеяйбітаў, аратых, гноявозаў і баранавальшчыкаў. Жывёлагадоўчая брыгада складаецца з пяці груп: даглядчыкаў, сьвінаводаў, конюхаў, пайльшчыц цялят, а ўсіх 32 чалавекі. Садова-агародная брыгада—садоўнікі і гароднікі, —20 чалавек. Ёсьць брыгада ўнутранога абслугоўваньня і інш. У камуне устаноўлена пэўная норма вынрацоўкі і прынята тарыфная сетка—6 разрадаў ад 75 кап. да 1 р. 75 к. Адначасова ўведзена зьдзельшчына. Усё гэта спрыяла вялікаму ўздыму прадукцыйнасьці працы камунараў.

Усе ва ўдарнікі

Уся камуна стала ўдарнай. Брыгады ўступілі паміж сабою ў сацыялістычнае спаборніцтва. У выніку гэтага і да таго высокія нормы выпрацоўкі (баранаваньне 1 з пал. гэкт., ворыва 0,7 гэкт., сяўба з пал. гэкт.) перавышаліся на 20-35 проц. «Сьвят у нас,—кажа старшыня камуны т. Галавачэнка,—у часе сяўбы ня было. Усе працавалі, як чэрці».

Скончыўшы сяўбу за 2 дні да тэрміну, які быў вызначан плянам, камунары кінулі свае сілы на дапамогу калгасу «Камінтэрн». Некалькі дзён на цалёх «Камінтэрну» працавала 45 нар рабочых коняй, 30 рабочых мужчын. Быў адрамантаваны ўвесь сельска-гаспадарчы інвэнтар. Ры дапамозе камунараў і камінтэрнаўцы сваячасова скончылі сяўбу. Яны засеялі над яравыя 120 гэкт.

Камуна нарадзіла калгас

«Ужо вясною,—заяўляюць камунары, —наша камуна нарадзіла калгас». Вынікам масавай работы сталінцаў зьявілася арганізацыя калгасу «Камінтэрн» на плошчы больш 300 гэкт. У калгас увайшлі 24 гаспадарні вёскі Іванівічы. Камунары вялікую ўвагу аддаюць калгасу «Камінтэрн». Гэта праяўляецца на гаспадарным замацаваньні і разьвіцьці калгасу. Там абсталяваны свая калёсная майстэрня, кузьня, узводзяцца будынкі. Цяпер камінтэрнаўцы ўжо дапамагаюць індывідуальнікам. Камінтэрнаўцы дзейнічаюць наказам.

Бальшавіцкім тэмпам

Ужо пісалася («Зьвязда» ад 17-га мая) аб рабоце сталінскіх камуністых. Аб іх працы трэба сказаць яшчэ. Ячэйка камуны мацнее і расьце такім-жа тэмпам, як і камуна. Парт'ячэйка абрастае моцным батрацка-бядняцкім актывам. Лепшыя з гэтых актывістых уступаюць у рады партыі. Напярэдадні XIII-га зьезду КП(б)Б падана 12 заяў аб уступленьні ў партыю. За дзевяць месяцаў ячэйка вырасла ў чатыры разы (на колькасьці членаў). Тое-ж самае мы маем і з камсамольскай ячэйкай. Адзін з камсамольцаў кіруе вытворчай нарадай.

Уся партарганізацыя Парыцкага раёну вучыцца ў сталінскіх камуністых (а вучыцца ёсьць чаму) таму, як патрэбна працаваць.

Пашырылі плошчу на 13 проц.

У часе веснавой сяўбы працавалі 6 ударных брыгад. Сяўба ў камуне, дзякуючы ўдарніцтву і сацспаборніцтву, праведзена па-баявому. Намечаны камунарамі плян сяўбы перавыкананa на 13 проц. Усяго засеяна 256 гэкт. паступнымі культурамі: бульбы—40 гэкт., ячменю—10 гэкт. аўсу—50 гэкт., шпанёлы —50,2 гэкт., канюшыны—47 гэкт., цімафеёўкі — 12,1 гэкт., сэрадэлі—12 гэкт., лубіну—26,5 гэкт. (6 гэкт. лубіну пад насеньне), вікі—20 гэкт., гароднінны—9,80 гэкт., грэчкі—28,3 гэкт. Усе культуры закантрактаваны. Акрамя гэтага засеяна 5 гэкт. кукурузы, 9 гэкт. кармавых буракоў. Камуна ўзяла жывёлагадоўчы напрамак. У сувязі з гэтым будуецца сіласная вежа на 26 тыс. пудоў масы. Стада малочнай жывёлы да восені гэтага году з 150 штук павялічыцца да 320. Праводзіцца падрыхтоўка да ўборкі ўраджаю.

Закупляюцца ўборачныя машыны. Уся рабочая і людзкая сіла нагатове.

Камуна ўсё яшчэ будуецца

Камуна імя Сталіна яшчэ толькі на шляху свайго разьвіцьця. Ідзе вялікае гаспадарчае будаўніцтва на суму ў палову млн. руб. Спачатку мая распачата набудова крухмальнага заводу, кошт там у 250 тыс. рублёў. Хутка будзе скончана набудова паравога млыну. Будуецца бэконны гадавальнік на 500-600 штук, цагельня, якая будзе ўмяшчаць 50 тыс. штук цэглы (вынялка аднэй печы), ставяцца новыя будынкі.

«Свая цагельня для будаўніцтва камуны мае вялізарнае значэньне. Толькі для таго будаўніцтва, якое цяпер праводзіцца, свая цэгла дасьць эканомію ў 90—100 тыс. рублёў»—сьцьвярджаюць спэцыялісты.

Фактарам вялікай важнасьці зьяўляецца тое, што ўсё будаўніцтва ў камуне праводзіцца рукамі саміх камунараў. Яны і цяпер працуюць напружана. У вольны ад работы час камунары чытаюць кнігі, газэты і інш. Усе камуністы—20 чалавек—чытаюць «Зьвязду», выпісваецца 60 экз. іншых газэт. Адчынен і працуе чырвоны куток, яслі на 60 дзяцей, абсталявана і адчынена сталоўка, у якой харчаваньне за дзень каштуе 47 кап. Усе камунары харчуюцца сваёй сталовай.

Вось як працуе камуна, якая носіць імя правадыра партыі бальшавікоў—тав. Сталіна.

Е. Салдаценка.

Абяцаньне выканаем

Рапарт рабочых і служачых фабрыкі „Беларуска".

Наша фабрыка была пушчана ў пэрыяд паміж XII і XIII партыйнымі зьездамі КП(б)Б, усяго паўтары гады назад. З пачатку на фабрыцы працавала 25 рабочых. Зараз працуе 400 чалавек і з кожным днём лік рабочых павялічваецца. Але ў рабоце нашай фабрыкі ёсьць вялікія недахопы.

За першы квартал бягучага гаспадарчага году цэх па вырабе грэбняў выканаў вытворчую праграму на 78 проц., а цэх па вырабе гузікаў — на 19 проц., што складала ў сярэднім па фабрыцы 49 проц.

Прарыў першага кварталу ўзварушыў усю грамадзкасьць фабрыкі. Парт'ячэйка і фабком перабудавалі сваю работу, заваструўшы пытаньне на ліквідацыі прарываў. Пачалі расьці ударныя брыгады. Цэх па вырабе грэбняў зрабіўся ўвесь ударным, а лепшыя ўдарнікі ўступілі ў рады КП(б)Б. У выніку цэх па вырабе грэбняў за другі квартал ліквідаваў свой прарыў і ЗА ПАЎГОДЗЬДЗЕ ВЫКАНАЎ СВАЮ ВЫТВОРЧУЮ ПРАГРАМУ НА 106 ПРОЦ.

Адстае яшчэ цэх па вырабе гузікаў, які за паўгодзьдзе выканаў сваю праграму ўсяго на 50 проц. Такім чынам, за першае паўгодзьдзе фабрыка ўсё-ж НЕДАВЫКАНАЛА сваёй праграмы НА 23,6 ПРОЦ.

Мы кладзем усе сілы, мабілізуем увагу рабочых цэху па вырабе гузікаў на ліквідацыю прарываў. Апошнія месяцы паказваюць некаторы зрух. За красавік фабрыка выканала вытворчую праграму НА 92 ПРОЦ.

У ЧАСЕ ПАДРЫХТОЎКІ ДА XIII УСЕБЕЛАРУСКАГА ЗЬЕЗДУ ПАРТЫІ І ДА XVI УСЕСАЮЗНАГА ПАРТЫЗЕЗДУ, РАБОЧЫЯ ФАБРЫКІ «БЕЛАРУСКА» ДАЛІ АБЯЦАНЬНЕ ВЫКАНАЦЬ ПРАМФІНПЛЯН.

РАПАРТУЮЧЫ СЁНЬНЯ XIII ЗЬЕЗДУ КП(б)Б, МЫ Ў ЯКАСЬЦІ ПАДАРУНКУ ПАДНОСІМ ЗЬЕЗДУ ВЫКАНАНЬНЕ ВЫТВОРЧАЙ ПРАГРАМЫ ЗА МАЙ НА 102 ПРОЦ.

Мы на гэтым не супакоімся. Мы ставім сабе задачу яшчэ больш узмацніць тэмпы нашай работы, каб поўнасьцю ліквідаваць прарыў першага паўгодзьдзя. І выніку работы за май даюць нам упэўненасьць, што мы прамфінплян выканаем. Мы заяўляем XIII зьезду КП(б)Б, што прарыў на нашай фабрыцы да канца гаспадарчага году будзе поўнасьцю ліквідаваны.

Нахай жыве XIII-ты зьезд КП(б)Б!

МІТЫНГ РАБОЧЫХ І СЛУЖАЧЫХ ФАБРЫКІ «БЕЛАРУСКА».

Першыя перамогі акулярнай фабрыкі

Пасьля буйнога прарыву ў першым паўгодзьдзі, наша акулярная фабрыка (Віцебск) толькі цяпер пачынае загойваць свае раны. Красавік даў выкананьне вытворчай праграмы на 113 проц., май — на 111 проц.

У перадзе ідзе цэх фітцу, які заваяваў сабе месца на чырвонай дошцы. Ён выконвае сваю вытворчую праграму на 125-130 проц. Апошняя пяцідзёўка па цэлюлёідным цэху дае выкананьне праграмы на 127 проц.

Расьце ударніцтва. У ахоўваючым цэху арганізаваны дзьве ўдарныя брыгады і адна вытворчая камуна імя XVI партызезду. ЦЭХ ФІТЦУ Ў ПАДАРУНАК XVI ПАРТЗЬЕЗДУ ДАЕ АБЯЦАНЬНЕ ВЫКАНАЦЬ ПРАГРАМУ НА 130 ПРОЦ. І ЗНІЗІЦЬ САБЕКОШТ НА 10 ПРОЦ. Выклік, зроблены ім цэлюлёіднаму заводу на перавыкананьне прамфінпляну з такімі-ж паказальнікамі, прыняты.

Расьце ініцыятыва мас. Брыгада абшывальшчыц пад кіраўніцтвам брыгадзіра — партыйкі БАРЗЯНКОВАЙ, павялічвае прадукцыйнасьць працы, за што ёй у падарунак фабрыка выпісвае на год газэту «Правда». Не адстае і камсамолец АРШАНСКІ. За кароткі тэрмін ён дабіўся павялічэньня прадукцыйнасьці працы на 10 проц. Таксама павялічыла сваю прадукцыйнасьць нядаўна арганізаваная брыгада аптычак на 25 проц.: замест 20 тузін шкла ў дзень у аптычнай справе зараз паасобныя ўдарнікі ўстаўляюць да 30 тузін, значна зьменшыўся боў шкла.

Тэхнік тав. АРШ падаў заяву аб жаданьні ўступіць у партыю. Вынаходца МАР'ЯНСКІ пабудаваў спэцыяльны штамп для аправы сыстэмы «Інтэрнацыянал», даўшы вялікую эканомію. Сьлесар тав. ЗУЕЎ сканструяваў варштат для загінаньня шофэрскіх акуляраў. Сьлесар БАРТКЕВІЧ вынайшаў спэцыяльны варштат для фразіроўкі цэлюлёідных ножак, што дае эканоміі 10 руб. кожны дзень.

XVI ПАРТЗЬЕЗД УЗВАРУШЫЎ РАБОЧУЮ МАСУ. Творчая хваля пераліваецца з цэху ў цэх, з брыгады ў брыгаду. Рабочыя кажуць: «Мы, ня гледзячы на ўсе труднасьці, будзем змагацца за давядзеньне нашага аптычнага шкла — якасьцю ня горш і коштам ня вышэй за замежнае».

Бар. ВОЛГІН.

На ўдарныя тэмпы

Жлобінская партыйная арганізацыя разгарнула вялікую работу вакол падрыхтоўкі да зьезду партыі. На ўсіх партсходах прапрацоўваюцца тэзісы да XVI зьезду партыі. На сходы прыцягваюцца і беспартыйныя рабочыя. На сходзе рабочых дэпо Жлобінскага вузла рабочыя аднагалосна ўхвалолі пастанову аб пераходзе на балывя тэмпы работы, ліквідацыі прарываў, аб паляпшэньні якасьці прадукцыі. Арганізаваны новыя брыгады імя зьезду.

Рабочыя патрабуюць, каб прамфінплян дэпо быў даведзены да кожнага варштату і кожнага рабочага.

Арганізаваны брыгада на зборы прапаноў.

Рабочыя 19 разьезду ў ліку 1.000 чалавек ва ўхваленай рэзалюцыі абавязуюцца поўнасьцю выканаць прамфінплян, разгарнуць сацспаборніцтва, стварыць брыгады імя зьезду і прыняць усе меры да таго, каб зьнізіць сабекошт. Сход паслаў прывітальную тэлеграму XIII зьезду КП(б)Б.

Нават на такім адсталым вучастку, як лесазавод, зараз заўважаецца пералом. На заводзе да апошняга часу адсутнічала сацспаборніцтва, ударніцтва, ня было масавай работы, ня было крытыкі і самакрытыкі. Зараз работы пастанавілі правесьці ўсю работу па ударным тэмпы, заключыўшы паміж сабою дагавор на сацспаборніцтва і выклікаўшы на сацспаборніцтва адзін з лесазаводаў Бабруйшчыны.

Брыгадзір «Зьвязды» РАЙХЛІН.

Заява 33 ударнікаў

ГОМЕЛЬ. (Па тэлефону).

4-га чэрвеня на мітынгу рабочых гомельскага заводу «Пралетары», прысьвечаным XVI зьезду УсеКП(б), мэханічны цэх, які налічвае 300 рабочых, абвясьціў сябе ўдарным імя XVI зьезду партыі.

У маі мэханічны цэх ішоў уперадзе ўсіх цэхаў, выканаўшы вытворчую праграму на 109,6 проц.

На мітынгу 33 старэйшыя пралетары заводу падалі заяву аб жаданьні ўступіць у партыю. У заяве гаворыцца, што яны ўвесь час актыўна працавалі пад кіраўніцтвам партыі за выкананьне прамфінпляну, за тое, каб завод быў заўсёды крэпасьцю нашай партыі. Зараз, калі на шляху пераможнага сацыялістычнага будаўніцтва сустракаюцца труднасьці, калі панікёры, малаверы, апартуністыя розных колераў працуюць сьцягнуць партыю з правільнага шляху, у такі момант мы ня можам быць па-за радамі партыі. Мы ўступаем у партыю для актыўнай работы і змаганьня за ленінскае адзінства нашай партыі. Мы глыбока ўпэўнены ў правільнасьці кіраўніцтва нашай партыі.

Брыгадзір «Зьвязды» ЛЕВІН.

Пяцігодку—у тры гады

2-га чэрвеня ў Жлобіне адбылася другая канфэрэнцыя ўдарнікаў-чыгуначнікаў. На канфэрэнцыі прысутнічала звыш 250 ударнікаў Жлобіна, Магілева, Слуцка, Асіпавіч і інш.

Канфэрэнцыя паслала прывітальную тэлеграму XIII зьезду КП(б)Б, якая была прынята з вялікім уздымам.

Дэпо ст. Жлобін мае рад дасягненьняў: замест 31 паравозаў, паводле заданьня, адрамантавана 46 паравозаў. Прастой паравозаў складаў у першым квартале 9,5 дзён, а ў другім квартале — 8,5 дзён. Сабекошт зьніжаны на 6,5 проц. Замест 12 паравозаў, паводле заданьня, адрамантаваны па бягучым рамонце 23 паравозы. Зьнішчаны прастоі і прагулы. Прабег паравозаў павялічыўся да 103 проц. Выдаткаваньне электраэнэргіі зьніжана на 20 проц. і г. д.

Але разам з гэтым канфэрэнцыя адзначыла рад недахопаў. Гаспадарнікі, інжынэрна-тэхнічныя работнікі, вытворчыя камісіі і нарады ў сацспаборніцтве прымалі вельмі слабы ўдзел. Мала зьвернута ўвагі на рацыяналізацыю вытворчасьці. **Прамфінплян да гэтага часу да варштату не даведзены.**

У спрэчках выказалася каля 20 чалавек. І ва ўсіх была адна думка, што толькі шляхам узмацненьня ўдарніцтва можна зьнішчыць усе прарывы.

Канфэрэнцыя адзнагалосна пастанавіла назваць сябе ўдарнай групай імя XIII і XVI зьездаў партыі і прылажыць усе сілы, каб выканаць пяцігодку ў тры гады. Апрача таго, быў ўхвалены рад практычных прапаноў аб паляпшэньні работы на чыгунцы.

Лепшыя ўдарнікі, у ліку 16 чалавек, былі прэміраваны.

Аб перабудаваньні с.-г. кааперацыі БССР

(У парадку абгаварэньня)

Тэзісы тав. Якаўлева да XVI зьезду камп партыі ў часьці арганізацыйнага пабудаваньня сыстэмы сельска - гаспадарчай кааперацыі даюць агульныя ўстаноўкі работы калгасна - кааперацыйнай сыстэмы.

Зыходзячы з гэтага, я лічу неабходным выказаць на старонках друку свае некаторыя меркаваньні аб гаспадарчых узаемаадносінах і аб арганізацыйным пабудаваньні калгасна - кааперацыйнай сыстэмы ва ўмовах БССР.

З былога Белсельсаюзу ў працягу 1—1½ год вылучана 5 арганізацый: Белкалгасцэнтр, Белсельснаб, Малаўсаюз, Белсадкалгасаюз і Белпаляводсаюз. У акругах існуюць: малаўсаюзы, паляводсаюзы, аркалгасаюзы і ўпоўнаважаныя Белсадсаюзу з пэўным штатам супрацоўнікаў, а ў Гомелі пават садсаюз (замест упоўнаважанага).

У адносінах першапачатковай сеткі, пастанова ЦК УсеКП(б) ад 27 чэрвеня 1929 году ў нашых умовах, па цэлым радзе прычын — ня выкананa. Ці дапушчальна ў далейшым такое становішча? Бязумоўна, не. У адпаведнасьці з тэзісамі тав. Якаўлева трэба дастасоўна да БССР унесьці некаторыя практычныя прапановы.

Я лічу, што Калгасцэнтр павінен быць пераўтораны ў саюз саюзаў калгасна-кааперацыйнай сыстэмы і сапраўды заняць гэта месца не на словах (і паперы), а на справе. На жаль, да сёняшняга дня ён не зьяўляецца такім. Магчыма, што прычына гэтага — наша арганізацыйнае пабудаваньне (акркалгасаюзы). Але як-бы там ні было, дваістасьць і паралелізм, якія існуюць зараз у рабоце, толькі параджаюць блытаніну і паслабляюць арганізацыйную і вельмі часта гаспадарчую адказнасьць спэцыяльных саюзаў.

Ва ўсякім выпадку, прапанова тав. Саркіса (дыскусійны лісток «Правды» № 1) аб непатрэбнасьці ў нацрэспубліках саюзу саюзаў, на маю думку, зьяўляецца няўжытнай. Трэба, аднак, ліквідаваць паралельныя арганізацыі і паралелізм у рабоце, стварыць сапраўды арганізуючы цэнтр з цяперашняга Калгасцэнтру.

У нашых умовах «Сельхозснаб» (Белсельхозснаб) зьяўляецца арганізацыяй падзьвычнай дарагой і непатрэбнай, асабліва ў сувязі са стварэньнем усесаюзнага машынаазабясьпечваючага канцэрну і цэнтралізацыі ва ўсесаюзным маштабе сельска - гаспадарчай кааперацыі.

Абмяжоўваючыся практычна завозам сельска - гаспадарчых машын, «Белсельхозснаб» ня прымае і ня можа прымаць ніякага ўдзелу ў іх рэалізацыі і кантраляваць рэалізацыю машын. Бо на існасьці ў плянаваньні і рэалізацыі машын удзельнічаюць усе сыстэмы сельска - гаспадарчай кааперацыі, пачынаючы ад Калгасцэнтру і Белпаляводсаюзу і канчаючы райсаюзам і населяльным таварыствам. Апрача таго, нямысліма арганізацыя вытворчасьці і перабудаваньня дробнае, раздробленае сельскае гаспадаркі ў больш высокія і буйныя формы (г. зн. у калгасы) без арганізацыі забясьпячэньня гэтых гаспадарак адпаведнымі сродкамі вытворчасьці і ўзьдзейнасьці апошнімі на рэканструкцыю вёскі. На справе-ж вельмі часта забясьпечваючая арганізацыя завозіць тыя тавары і сродкі вытворчасьці, якія зусім не патрэбны, часта дрэннае якасьці. На гэтым яе «місія» скончана.

Я лічу, што забясьпячэньне сродкамі вытворчасьці павінна быць ускладзена на тыя арганізацыі, якія арганізуюць самую гаспадарку і якія адказваюць за сваячасовае і поўнае забясьпячэньне гэтых гаспадарак сродкамі вытворчасьці.

У гэтых адносінах бязумоўна правільна пастанова фінансавае нарады і прауленьня Хлебацэнтру. Ва ўмовах БССР не неабходна ўжыць. У свой час Цэнтраземкладі ліквідавалі, але і пешта падобнае Цэнтраземкладу, бадай, таксама непатрэбна.

Што датычыць спэцыяльных цэнтраў сельска - гаспадарчай кааперацыі: Белмалаўсаюзу, Белкалгасаюзу і Белпаляводсаюзу, дык на даны адрэзак часу яны павінны застацца, маючы ў перспэктыве вылучэньне Сьвінаводсаюзу і Насенаводсаюзу.

На існуючыя цэнтры павінна быць ускладзена арганізац

Палац навукі і мэдыцыны

Адзіны ў БССР фізіятэрапэўтычны інсытут

Савецкая Беларусь абагацілася новай каштоўнай навукова-лекавай установай —фізіятэрапэўтычным інстытутам.

Фізіятэрапэўтычны інстытут вырас з невялікай клінікі па нэрвовых хваробах, якая 6 год назад адкрылася ў Менску па Сьвярдлоўскай вул. Клініка за параўнальна кароткі тэрмін сваімі работамі стала вядома далёка за межамі БССР і нават СССР. Работы клінікі абгаворваліся на Ўсесаюзных зьездах і міжнародных навуковых кангрэсах.

— Новы інстытут—цэнтр навуковай думкі БССР у галіне нэўрапаталёгіі. Па сваім абсталяваньні і прапускной здольнасьці ён ня ўступае лепшым фізіятэрапэўтычным інстытутам СССР.

Інстытут складаецца з наступных адзяленьняў—фізіятэрапэўтычнага, ортапэдычнага, нэрвовай клінікі і псыханэўралёгічнага дыспансэру і стацыянэраў: ортапэдычнага на 20 ложкаў і для нэрвовых хворых—на 50 ложкаў. Адкрываецца аддзяленьне для нэрвовых хворых дзяцей на 20 ложкаў.

Будаўніцтва інстытуту яшчэ ня скончана. На суседнім вучастку будзе пабудаваны дыспансэр з стацыянарам для наркаманаў і інтэрнат для прыяжджаючых хворых з акруг БССР.

Фізіятэрапэўтычнае аддзяленьне пабудавана паводле апошнята слова мэдычнай навукі і тэхнікі і мае аддзелы: электра, сьветалячэньня, кварца, цепла, вода, грязялячэньня.

Некаторыя віды фізычных мэтадаў лячэньня, як спэцыяльныя ванны і грязялячэньне, ужываецца ў БССР упершыню. Для грязялячэньніцы вынісваюцца вагоны грязі з Адэсы, Сакі і інш. крыніц.

Грязялячэньніца адкрыецца яшчэ ў сярэдзіне гэтага лета.

Пры інстытуце ёсьць добра абсталяваная навуковая амбуляторыя з радам аддзяленьняў, якія працаваць будуць актуальныя тэмы, як досьледы прафшкодвасьцяй, экспэрымэнты над уплывам алкаголю і сьвінцу і г. д. Тут падзяленьняў—фізіятэрапэўтычнага, ортапэдычнага, нэрвовай клінікі і псыханэўралёгічнага дыспансэру і стацыянэраў: ортапэдычнага на 20 ложкаў і для нэрвовых хворых—на 50 ложкаў. Адкрываецца аддзяленьне для нэрвовых хворых дзяцей на 20 ложкаў.

Лячэньне ў фізіятрычным інстытуце

на ўлавіць такія нязначныя вьмены ў нэрвовай сыстэме, якія не паддаюцца выкрыцьцю звычайнымі досьледамі. На надыходзячым сёлета міжнародным зьезьдзе ў Льежы пытаньне аб хронаксымэтрыі стаіць, як праграмная тэма.

З работы псыханэўралёгічнага дыспансэру асаблівую цікавасьць яўляюць пасьняховае лячэньне заік і абсьледваньне раду шкодных для нэрвовай сыстэмы прафэсій, як друкароў, гарбароў і г. д. У выніку работы дыспансэру каля 50 проц. заік пасьля лячэньня зусім вылечылася.

Новы інстытут—сваясаблівы лекавапрафілактычны камбінат. Ён здольны працускаць каля 2.000 чал. у дзень. Але ўсё-ж інстытут ня можа задаволіць вялікай патрэбы ў фізычных мэтадах лячэньня.

Інстытут павінен быць пашыраны шляхам абсталяваньня новых памяшканьняў для фізкультурнай работы, інгалаторыя і г. д.

У акруговых гарадох БССР трэба адкрыць аддзяленьні фізіятэрапэўтычнага інстытуту.

З адкрыцьцём у Менску новага фізіятэрапэўтычнага інстытуту ня трэба будзе пасылаць на курорты раду хворых, якія змогуць атрымаць усе віды лячэньня на месцы.

МІХ. КІН.

Бюракраты з энэргбюро ВСНГБ

Энэргбюро ВСНГБ напляваецьскі адносіцца да патрэб Менскага Эльводу. Як вядома, Менск перажывае энэргетычны крызіс. Станцыя працуе з празмернай нагрузкай. Да зарэзу патрэбна новая электрастанцыя. Між тым, энэргбюро затрымлівае перадачу заказу на абсталяваньне для новай электрастанцыі.

Зусім ня ўлічваючы мясцовых умоў, энэргбюро прапанавала Эльводу тэрмінова зьмяніць рэльтаж. Калі-б гэта прапанова была праведзена ў жыцьцё, прышлося-б зьмяніць усе маторы на прадпр[illegible]ствах, лямпачкі ва ўсіх кватэрах і ўстановах гораду і 106 трансфарматараў.

Ня гледзячы на поўную недарэчнасьць прапановы, энэргбюро забараніла Эльводу заказваць абсталяваньне пры існуючым [illegible]жы. Вытворчы сэктар Эльводу разам з інжынэрна-тэхнічнымі працаўнікамі ГЭТ'у адзначыў лёгкадумны падыход бюро да важнейшых пытаньняў энэргетычнай гаспадаркі. Вытворчы сэктар запрасіў прадстаўніка энэргбюро на нараду для абгаварэньня разам з рабочымі пытаньня аб вальтажы, але прадстаўнік не зьявіўся.

Яшчэ адзін факт. Эльводу, каб пашырыць станцыю, не хапае апалу ў колькасьці 20-25.000 тон торфу (Цьнянскія балоты ня могуць даць больш намечаных 18-25.000 тон, а патрэбна 50.000).

Пытаньне аб апале з надзвычайнай вострасьцю паўстае зараз перад Эльводам. Вытворчы сэктар Эльводу паставіў пытаньне аб апале, як баявую задачу дня, і склікаў вытворчую нараду, на якую былі запрошаны прадстаўнікі энэргбюро ВСНГБ. І на гэты раз яны ня прызналі патрэбным зьявіцца на вытворчую нараду, каб разам з рабочымі вырашыць балючае пытаньне.

Дзень трактара ў Беларусі

20-га чэрвеня ў саўгасах і калгасах БССР будзе праведзены «дзень трактара». Д[illegible] правядзеньня гэтага дня пры камітэце саюзу с.-г. рабочых створаны спэцыяльны штаб.

Задачы «дня трактара»—мабілізаваць рабочых саўгасаў, а таксама і калгасьнікаў на барацьбу супроць паломак трактараў, за ашчадныя адносіны да іх, узорнае ўтрыманьне трактарнага парку і г. д.

Ва ўсіх саўгасах і калгасах выпушчаюцца брыгады з 4-х чалавек, якія праверяць становішча трактараў, прычэпных машын, а таксама адносіны трактарыстых да машын. Адначасова брыгады вызначаць практычныя мерапрыемствы па паляпшэньні трактарнай гаспадаркі. Лепшыя трактарыстыя будуць прэміяваны.

Вызначана правядзеньне некалькіх экскурсій лепшых трактарыстых у буйнейшыя саўгасы, калгасы і машына-трактарныя станцыі СССР. Апрача таго, выдзелена ў якасьці прэмій 6 месц для трактарыстых у дамох адпачынку.

У некаторых саўгасах рыхтуюцца агітсуды над злоснымі паломшчыкамі трактараў і машын. Грамадзкімі абвінаваўцамі выступяць прадстаўнікі рабачкомаў—лепшыя ўдарнікі.

20-га чэрвеня ва ўсіх саўгасах і калгасах, дзе ёсьць трактары, адбудуцца вечары. Да правядзеньня «дня трактара» прыцягваюцца камсамол, аўтадор і інш. грамадзкія арганізацыі.

Спыніць цкаваньне Трапачкі

Няправільную пастанову Аршанскай АКК трэба перагледзець

У верасьні мінулага году па складзе Горацкага спажывецкага таварыства сапсавалася звыш 31.000 кілёграм белай мукі.

Хто вінаваты ў гэтым?

Нарэшце-ды 3-га вучастка Аршанскай акругі т. **Трапачка**, які расьсьледаваў гэту справу, знайшоў, што ў сапсаваньні мукі вінаваты старшыня Горацкага спажывецкага таварыства **Шыловіч**. Апошні, ведаючы аб тым, што на складзе Горацкай акадэміі ёсьць сапсаваная мука, прыняў са складу 8.750 кілё, перавёз гэту муку на склад т-ва і тым сапсаваў яшчэ звыш 20.000 кілё.

У выніку расьсьледваньня трапілі пад суд старшыня т-ва **Шыловіч** і працаўнікі складу акадэміі **Хаценка і Сепекс.**

Здаецца, злачынства выкрыта, вінаватыя прыцягнуты да адказнасьці. Слова за судом! Але справа не разгледжана і да гэтага часу.

Наадварот, супроць т. Трапачка пачынаецца цкаваньне. Выкрытыя ім пачынаюць шукаць усякіх прычын, каб пасадзіць сьледчага на лаўку падсудных. Яму прышіваюць грубасьць, скарыстоўваньне службовага становішча і г. д.

У № 75 «Савецкай Беларусі» зьмешчаецца артыкул «Кар'ера сьледчага Трапачкі», у якім ён абвінавачваецца ў прасьледваньні актывісткі-камсамолкі, дачкі сумленнага калгасьніка Ратніцкай. На справе гэта Ратніцкая—дачка былога гандляра, вычышчанага з калгасу і высланага за межы БССР. У гэтым-жа артыкуле адзначаецца, што Трапачка помсьціўся старшыні спажывецкага таварыства Шыловічу, які зьняў з работы ў таварыстве жонку сьледчага.

Апошняя была заўважана ў радзе злачынстваў.

Артыкул быў зьмешчан 31 сакавіка, а 3 красавіка Аршанская АКК-РСІ абвергла абвінавачаньні, высунутыя супроць жонкі Трапачкі, і аднавіла яе на працы.

Справа на гэтым ня скончылася. Тая-ж Аршанская АКК 18 мая разглядае справу па абвінавачаньні сьледчага Трапачкі ў прасьледваньні Ратніцкай, прычым паказаньні супроць сьледчага давалі Шыловіч і Ратніцкая.

АКК зусім ня ўлічыла, што Шыловіч зьяўляецца падсудным на справе, выкрытай Трапачкай, што Ратніцкая помсьціцца сьледчаму за артыкул, зьмешчаны ў праваднгазэце, аб яе сацыяльным пахаджэньні. АКК пастанавіла Трапачку з работы зьняць і забараніць яму працаваць у судова-сьледчых органах.

Так пацарпеў судовы працаўнік, які 13 год працаваў у судова-сьледчых органах і шмат карысьці прынёс савецкай уладзе.

Пракуратура і ЦКК НК-РСІ павінны расьсьледваць гэту справу, зьняць ганебную пляму са сьледчага Трапачкі і прыцягнуць да адказнасьці сапраўдных злачынцаў.

ПНОЎ.

Буйнейшы ў Беларусі каніфольна-шкіпінарны завод

У Бабруйскай акрузе канчаецца пабудова магутнага канфольна-шкіпінарнага заводу Наркамзему БССР.

Завод будзе перапрацоўваць 900 пудоў жывіцы ў суткі, г. зн. у два разы больш, чым існуючы барысаўскі завод. На гэтым-жа заводзе будзе арганізавана спэцыяльная хэмічная лябараторыя, якая будзе абслугоўваць усе каніфольна-шкіпінарныя заводы Беларусі і вывучаць якасьць іх прадукцыі. Пуск заводу вызначаны ў гэтым-жа сэзоне.

Як ідзе сплаў

На 1-ае чэрвеня па БССР вывезена да сплаўных рэк 1.900 тыс. кубамэтраў лесаматар'ялаў, пушчана па сплаўных рэках—1.100 тыс.; прыбыла да канчатковых пунктаў 570 тыс. кбм. будаўнічага лесу.

Паводле пляну Лесбелу, за ўвесь час навігацыі павінна быць сплаўлена да канчатковых пунктаў 2.800 тыс. кбм. Такім чынам, заданьне выканана дагэтуль у разьмеры ад 40 да 50 проц.

Дагэтуль з лесу ня вывезена каля 900 тыс. кбм., калі прыняць пад увагу вызначаны плян Лесбелу.

Па Бабруйскай акрузе вывезена да сплаўных рэк 200 тыс. кбм., ужо прыбыла да пункту апрацоўкі 80.000 кбм. Па Барысаўскім раёне вывезена да сплаўных рэк 535.000 кбм. прыбыла да пунктаў апрацоўкі 62 тыс. кбм. лесаматар'ялаў.

ЗЬВЯЗДА.

МЕНСК

ДРЭННАЕ АБСЛУГОЎВАНЬНЕ СЭЗОНЬНІКАЎ

Прэзыдыум Менскага Акрвыканкому адзначыў, што мясцовыя арганізацыі вельмі дрэнна абслугоўваюць сэзоньнікаў. Не хапае інтэрнатаў і сталовак, гаспадарчыя арганізацыі слаба падрыхтаваны да прыёму рабочай сілы; на пабудовах не абсталяваны аптэчкі і г. д.

Прэзыдыум АВК запрапанаваў МЦРК зараз-жа арганізаваць грамадзкае харчаваньне для сэзонных рабочых. Гаспадарчым арганізацыям запрапанавана абсталяваць інтэрнаты для сэзоньнікаў і забясьпечыць пабудовы мэдыкамэнтамі.

НОВЫЯ РАБФАКІ Ў БССР

Наркамасьветы БССР пастанавіў адчыніць у гэтым годзе ў БССР два новыя дзенныя рабфакі у Бабруйску і Барысаве. У гэтым годзе на рабфакі будзе прынята 690 чалавек.

Акрамя дзенных рабфакаў, адкрываюцца 18 новых вячэрніх рабфакаў. Разам з існуючымі ў БССР будзе 25 вячэрніх рабфакаў.

ПРЫЁМ НА ЗАВОЧНЫ ПЭДФАК БДУ

З 15-га чэрвеня пачынаецца прыём на завочны пэдфак БДУ. Завочны пэдфак будзе мець сацыяльна-гістарычнае, палітыка-асьветнае, літаратурнае і пэдалёга-пэдагагічнае аддзяленьні. Усяго будзе прынята 500 чалавек. Тэрмін навучаньня—3 гады.

3.500 ТЫСЯЧ ПАСАЖЫРАЎ ПЕРАВЁЗ ТРАМВАЙ ЗА ПАЎГОДА

Прамфінплян Менскага трамваю за першае паўгодзьдзе выкананы з перавыконаньнем. Замест 2.800 тысяч пасажыраў (паводле пляну) перавезена 3.500 тысяч пасажыраў.

РАСПУШЧАНЫ МЯСЦКОМ БЕЛМАЛЖЫЕСАЮЗУ

За бязьдзейнасьць, перазагаваньне на рад нездаровых зьявішчаў, адсутнасьць кіраўніцтва сапсаборніцтвам і ўдарніцтвам і г. д. распушчаны мясцком Белмалжывсаюзу.

ПРЫЁМ У ВНУ Ў 30-31 НАВУЧАЛЬНЫМ ГОДЗЕ

Паводле пляну Наркамасьветы, у новым навучальным годзе будзе прынята ў БДУ 1.570 чалавек: на пэдфак—500 чал., на мэдфак—400, на факультэт народнай гаспадаркі—550, на факультэт савецкага будаўніцтва—120. У Віцебскі вэтэрынарны інстытут будзе прынята 300 чалавек. У палітэхнічны інстытут —540 чалавек.

Большасьць новых студэнтаў будзе прынята з ліку скончыўшых падрыхтоўчыя курсы, рэшта са скончыўшых не пазьней 2 год назад агульна-адукацыйныя курсы, рабфакі і прафшколы. Гэтыя катэгорыі паступаючых аспабаняюцца ад іспытаў.

БЮРО СУВЯЗІ З 25-ТЫСЯЧНІКАМІ

Пры саюзе сельгаслесарабочых арганізуецца бюро сувязі з 25-тысячнікамі. Адначасова ставіцца пытаньне аб арганізацыі пры ЦСПСВ аб'яднанага кансультацыйнага бюро для 25-тысячнікаў па спэцыяльных пытаньнях з удзелам спэцыялістых сельскай і лясной гаспадаркі.

ЗАНЯТКІ ФІЗКУЛЬТУРЫ Ў ШКОЛАХ САЦВЫХУ

Бюро фізкультуры пры НКЗА пастанавіла ўвесьці ў школах сацвыху спэцыяльныя гадзіны заняткаў па фізкультуры для слабасільных вучняў.

Курсы для жанчын-старшынь сельсаветаў

Пры ЦВК БССР адкрываюцца 2-хмесячныя курсы для перанадрыхтоўкі жанчын-старшынь сельсаветаў. На курсы былі прыняты 60 чал., галоўным чынам з ліку калгасьніц.

Сталоўкі пры ЖАКТ'ах

Пры жаклах Менску ўжо адкрылася 6 сталовак. Учора пачала працаваць новая сталоўка пры ЖАКТ'е № 13. Пры ЖАКТ'е № 2 адкрыўся дзіцячы сад.

Паскорыць пабудову ільна-апрацоўчых заводаў

Да справы мэханізацыі апрацоўкі ільну ў Беларусі прыступілі толькі сёлета, пакуль, што ў нязначным разьмеры. Будуюцца Дрысенскі ільна-апрацоўчы завод (з апрацоўкай у год 152 тыс. пуд. ільнянае саломы-трэсты) і Лёзьнянскі ільнакамбінат (з апрацоўкай звыш 300.000 пуд. трэсты ў год). Лёзьнянскі камбінат будзе мець электрычную станцыю (з атрыманьнем току з Асінбуду), аддзяленьне на апрацоўцы ільну, воўнапрадзільнае аддзяленьне, лесапільню і млын. Паводле пляну, гэтыя два першыя ў Беларусі ільназаводы павінны быць пушчаны ў верасьні, да сэзону апрацоўкі ільну.

Апрача таго, сёлета прыступлена да пабудовы ільназаводу ў Зарубах (Лядзянскі,—Дубровенскі аграіндустрыяльны камбінат). Вызначана яшчэ пабудова (на лініі ільнапяньковага аб'яднаньня) трох ільназаводаў—у Гарадку (Віцебшчына), Шклове (Магілёўшчына(і Боркавічах (Полаччына). Пабудова гэтых чатырох заводаў павінна быць скончана ў будучым годзе.

Для поўнай мэханізацыі апрацоўкі ільну БССР патрэбны 50-60 ільнаапрацоўчых заводаў. Да канца пяцігодкі, паводле пляну, павінна быць пабудавана звыш 30 заводаў, што больш чым на палову задаволіць патрэбы.

З пабудовай гэтых ільназаводаў павінна ў значнай меры павялічыцца колькасьць і палепшыцца якасьць ільна-валакна. Адначасе працаёмкасьць гэтай культуры, якая (працаёмкасьць) дагэтуль тармазіла больш шырокае разьвіцьцё ільнаводзтва.

У канцы пяцігодкі пры правядзеньні ўсяго комплексу мерапрыемстваў (пабудова ільназаводаў разам з пашырэньнем ільняных плошчаў і павялічэньнем ураджаю) БССР дасьць у год ня менш 3 міл. пудоў таварнага ільнавалакна—у тры разы больш чым зараз.

Весткі аб ходзе пабудовы Лёзьнянскага камбінату, прымушаюць настараёжыцца. Аказваецца, што вось ужо на працягу больш месяца ідзе перадача камбінату саўгасам «Адаменка» ільнапяньковаму аб'яднаньню. Перадача ідзе вельмі марудна. Гэта прывяло да значнага паслабленьня тэмпу будаўніцтва і выклікае апаску за своячасовы пуск камбінату ва ўстаноўлены тэрмін—у верасьні. Між тым, Лёзьнянскі камбінат забясьпечаны ў поўнай меры замежным абсталяваньнем, лясьнымі матар'ялямі з бліжэйшага лясьніцтва і ўсімі дэфіцытнымі матар'ялямі.

Л. Н.

Тэатр і музыка

„Евгений Онегин"

(Белдзяржтэатр, 3-га чэрвеня 1930 г.)

Опэрны паказ 3-га чэрвеня пацьвердзіў паважнасьць калектыву, што працуе цяпер у нас у Менску. Гэты паказ, зразумела, меў свае недахопы, але дадатныя яго бакі настолькі высоўваліся наперад, што прымушалі прабачаць недахопы і абумовілі агульнае прыемнае ўражаньне ад спэктаклю. Праўда, гэтага нельга сказаць пра перны паказ «Евгения Онегина».

Артыстка Карнецкая—Тацьцяна чаратожым сакавітым барытонам і высокай музычнасьцю, якая не дазваляе яму адхіляцца ад строгага і дакладнага выкананьня свае партыі, ці груба фарсаваць у паасобных мясцох сілу голасу. Выкананьне ім ролі Яўгенія можна назваць сапраўды культурным.

Артыстка Карнецкая—Тацьцяна чаравала як сваім надзіва прыгожым голасам, так і нейкай пяшчотнай цяплынёй, якою прасякнута было яе пяяньне.

І толькі дзе-ні-дзе адчувалася маладосьць, малая спрактыкаванасьць артыстки.

Артысты Сініцкі даў дацоні яскравы тып паэтычнага юнака-лятуценьніка, пэдаўнага студэнта. Паэтычна закахана і абвеянага чарамі паэзіі старога Гэйдальэбэрга. З вялікаю пчырасьцю праведзена была ім сцэна сваркі з Яўгеніем і вельмі паэтычна выканана арыя перад дуэлью.

Такое-ж прыемнае ўражаньне пакінулі і ўсе другарадныя пэрсанажы.

Галоўных хібаў паказу было дзьве На-першае, канструкцыя, у якой прайшла опэра. Канструкцыя не павінна скажаць намераў аўтара, перашкаджаць удзельнікам спэктаклю рабіць сваю работу. Між тым, пастаноўшчык апрацуў эпоху пачатку XIX стагодзьдзя ў вопратку эпохі XX стагодзьдзя. У першым малюнку пастаноўшчык пансаваў чыста гукавыя намеры аўтара, калі дзьве асобы жаночага квартэту няюць адкрыта перад публікай (Ларына і няня), а сьлеў дзьвёх іншых чуецца з унутраных пакояў дому. Ленскі пяе Анегіну пра цяністы і прыгульны сад, у якім яны знаходзяцца, а паўкола ані кусьціка. У сцэне балю Ларыных госьці таўкуцца на невялікай пляцоўцы, і сьмешна глядзець, як танцоры ў вальсе пікаюць адны другіх. Дзе пяе Ленскі сваю арыю? Ці гэта ў нейкай закінутай вясковай хатцы, чаму груба супярэчыць стол, пакрыты аксамітным абрусом і сьвечка ў добрым падсьвечніку па ім, ці нейкі паршывенькі цымарок местачковае гасьцініцы, аб чым гавораць характэрныя сьцены пакойчыка?

Другая хіба—у аркестр, які граў груба, а што найважней—без належнага ансамблю.

І яшчэ раз заўвага адміністрацыі опэры: спэктакль трэба пачынаць дакладна ў абвешчаны час і спыніць спазьненьні.

Ю. Дрэйзін.

Пакупец і прадавец

За апошні час стварыліся такія непармальныя ўзаемаадносіны паміж пакупцамі і работнікамі прылаўку, што людзі ўцякаюць з работы, вылучэнцы-рабочыя ня хочуць ісьці ў крамы МЦРК, а тыя, якія ўжо вылучаны, варочаюцца да варштату.

Мы тут падамо некалькі прыкладаў, якія характарызуюць аднабокія, ненармальныя адносіны многіх найшчыкаў і пакупцоў да работнікаў прылаўку. Вось у сталоўцы №1 двое падышлі да буфэтчыцы, каб ім што-небудзь адпусьціць, чаго ў буфэце ня было, і пачалі яе лаяць і пагражаць чысткай. У краму № 118 па Ленінскай вул. зайшоў нейкі Тасьман, сын былога галянтарэйнага гандляра і абапёрся на шкляны прылавак. І, калі прадаўшчыца яму сказала, што ён можа выдушыць шкло, дык той яе назваў «спэкулянткай» і гэта самае напісаў у кнізе скаргаў. У тую-ж краму зайшла адна жанчына выпіць шклянку вады і з тонам камандаваньня зьвярнулася да загадчыка крамай з такім малолёгам: «Не марудзьце там, давайце скарэй ваду, што за грубасьці, вы і нас жывяце, ідзе чыстка на вашу галаву і вас выкінуць у момант!»

У сталоўцы № 3 працуе ў якасьці загадчыка вылучэнец - рабочы пачаці шчык тав. Пакерман. І вось за тое, што ён у двух абедаючых забраў і выліў прынесеную гарэлку, хоча параўнаць яго набіць і набіла-б, каб не заступіўся адзін рабочы.

Да гэтага трэба дадаць, што правленьне МЦРК ня прымае мерыкіх мер, каб ахоўваць інтарэсы сваіх работнікаў ад такіх атак з боку пакупцоў і на ўскаргі работнікаў прылаўку дае адказ стэрэатыпны адказ: «Будзьце вытрывалы».

Зразумела, нам ня трэба ўладзіць галоўцы работнікаў прылаўку, калі яны дрэнна і нядбайна працуюць, але адначасова мы ня можам дапусьціць такіх адносін з боку пакупцоў. Трэба зрабіць нерадкі ва ўзаемаадносінах паміж пакупцамі і прадаўцамі.

РАБКОР.

Папраўкі

У тэзісах тав. Якаўлева да XVI-га партзьезду, зьмешчаных у «Зьвязьдзе» № 116, з **прычыны дрэннага прыёму па радыё** трапіў цэлы рад памылак.

У разьдзеле 2-ім пасьля слоў «(Адозва ЦК ад 2 красавіка 1930 г.)» працуючы наступны абзац: «гэтыя памылкі выклікалі ў радзе раёнаў ня толькі антыкалгаснае выступленьне, але і ў паасобных выпадках перарастаньне іх над узьдзейнасьцю кулацтва ў антысавецкія выступленьні. Прычым найбольш трывожным быў той факт, што:

«...з боку партыйных арганізацый нярэдкі спробы замазаць створанае становішча і замест прызнаньня і выпраўленьня сваіх памылак і недахватаў у рабоце, усё валіць на хістаньні серадняка». (Адозва ЦК ад 2 красавіка 1930 г.)».

У разьдзеле 2-ім, у апошнім абзацы, пасьля слоў: «што ў рашаючых збожжавых раёнах» прапушчаны наступныя словы: «аснoўная частка сяўбы праведзена калгасамі, а ў нязбожжавых раёнах» і г. д.

У разьдзеле 3-ім у 7-м пункце замест слова «водных крыніц энэргіі» павінна быць «мясцовых крыніц энэргіі».

У разьдзеле 4-м, п. 4 напісана «жывёлагадоўчых», павінна быць «сьвіна-водных».

У разьдзеле 4-м, у апошнім абзацы надрукавана «ў спажываючай паласе, дзе гэта вялікая колькасьць калгасаў адыграла важнейшую ролю», трэба: «ў спажываючай паласе, дзе гэта невялікая колькасьць калгасаў» і г. д.

У разьдзеле 5-м, у апошнім абзацы надрукавана: «зьезд лічыць труба на-правільнай маючую месца ў радзе раёнаў» і г. д., трэба чытаць: «зьезд лічыць труба няправільнай меўшую месца» г. д.

У разьдзеле 6-м у канцы 2-га абзаца надрукавана: «якія станоўць сапраўдными будаўнікамі сацыялізму», трэба чытаць: «якія станоўць сапраўднымі будаўнікамі сацыялізму ў сельскай гаспадарцы».

У разьдзеле 6-м у падпункце «а» пункту надрукавана: «ажыцьцяўленьні гэтых мерапрыемстваў правесьці у галінах, у якіх калектывізавана ня менш 30 проц. усіх сялянскіх гаспадарак» трэба чытаць: «ажыцьцяўленьне гэтых мерапрыемстваў правесьці ў вобласьцях, у якіх» і г. д.

У разьдзеле 6 у п. 2, падпункце «г» надрукавана: «г) перагледзець лік спэцыялізаваных цэнтраў на важнейшых галінах сельскае гаспадаркі», трэба «г) перагледзець лік спэцыяльных цэнтраў з захаваньнем спэцыялізаваных цэнтраў толькі па важнейшых галінах сельскай гаспадаркі».

У разьдзеле 6-м, п. 3 пасьля слоў: «Работа груп беднаты першаначатковых форм калектыўных гаспадарак павінна быць палепшана і ўзмоцнена» прапушчаны наступныя словы: «пачаткі толькі апіраючыся на беднату можна забясьпечыць пераход прасьцейшых абмеркаваньняў на вышэйшую ступень калектывізацыі».

У разьдзеле 2-ім у першым абзаце пасьля 8-га пункту заўважана: «ступная друкарская памылка. Надрукавана: «у запіраньні серадняка», трэба чытаць «у запіраньні».

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

СЁНЬНЯ

Дом Асьветы. А 7 гадз. веч. адбудзе адкрыты сход цэх'ячэйкі КП(б)Б школьных устаноў. Парадак дня: Прапрацоўка тэзісаў т. **Якаўлева** да XVI-га партзьезду. Запраш. настаўнікі г. Менску.

Сад Асьветы. Кіно—«Чалавек Агню», звыш праг. камэдыя «Все ради тебя» Пач. а 9 г. веч. У выпадку дрэннага надвор'я кіно пераносіцца ў Дом Асьветы. Пач. і сэан. а 8 гадз. веч., 2-га—а 10 гадз. веч.

БДУ. Сход яч. КП(б)Б паргасу, назначаны на 2-VI, пераносіцца на 6-VI і адбудзе а 19 гадз. веч. у актавай залі. Парадак дня: Прапрацоўка тэзісаў тав. Якаўлева, прыём у партыю праф. Вальфсона і Манава, плян работы бюро яч. Запраш. студэнты і навуковыя працаўнікі факультэту.

ЗАЎТРА

БДУ (прыродазнаўчы корпус, 2-й паверх) адбудзецца пасядж. а 7 гадз. в. асьпіранскага гістарычнага сэмінара. Даклад асьп. **Радневіча** на тэму: «Аграрныя спрэчкі ў III Дзарж. Думе». Запраш. навуковыя працаўнікі-гісторыкі, асьпір. ВАН і Камвузу, а таксама і студэнты.

БДУ. У памяшк. бухгальтэрыі адбудзе адкрыты сход яч.-КП(б)Б навуковых і тэхнічных працаўнікоў БДУ. Парадак дня: «Прапрацоўка тэзісаў да XVI партзьезду.

Клюб саўгандальслужачых. Юнацкая сэкцыя клюбу СГС разам з юнацкай сэкцыяй друкароў арганізоўваюць вялікі вечар на тэму: «Культ. націгодка і падрыхтоўка кадраў». Пач. а 8 г. веч.

Фрунз. РК КП(б)Б. У памяшк. клюбу працасьветы склікаецца 2-ая група раённага дэлег. сходу, куды павінны зьявіцца ўсе делегаты 1-й і 3-й групы. Пач. 7 гадз. веч. Яўка абавязкова.

Фрунз. РК КП(б)Б. У памяшк. Р[illegible] адбудзе нарада фракцый-жактаў па пытаньні праверкі дырэктыў па надрыхтоўцы і перавыбараў. Пач. а 7 г. веч. Яўка членаў фракцый абавязкова.

БАН. Пасяджэньне катэдры марксізму-ленінізму. У пар. дня—дакл. тав. Баканава: «Мэтадалёгія Сьпінозы». Пач. 1-й г. дня. Уваход вольны.

БДУ. У канц. БДУ (корпус хэмфаку) нарада навуковых працаўнікоў—камуністых БДУ. Парад. дня: «Становішча работы з навуковымі працаўн. і далейшыя задачы» Пач. а 7 гадз. веч. Яўка абавязкова.

Жакт № 5. Агульны сход камуністы—жыхароў Жакту у канц. Пач. а 7 гадз. веч.

ПАСЬЛЯЗАЎТРА

БДУ. У габін. прарэктара адбудзе пасядж. асьпіранскага бюро. Выклік. т. Багданскі, Чабан, Гэркс. Пач. а 5 гадзіна. Пасядж. фракцыі бюро адбудзе там-жа. Пач. а 4 з пал. г. дня.

Фрунз. РК ЛКСМ. У пам. Дому Працасьветы нарада палітбайцоў на пытаньні вынікаў палітбою. Модус прадстаўніцтва—адзін ад 5-ці. Пач. а 7 г. в.

Пэдгабінэт. Канфэранц. «О» груп перадсесіа на 7-VI а 17 гадзін, 6-VI—канцовы і літаратуры, а 10 г., 7-VI—нямецкай мовы, васпізацыі і фізвыху а [illegible] г., 8-VI а 10 г.—3 група, 9-VI а 10 г.—4 група, 10-VI а 10—г. сьневаў і музыкі.

Адказны рэдактар Ян. АСЬМОЎ.

ЦП САЮЗУ САЎГАНДАЛЬСЛУЖАЧЫХ

паведамляе, што 7-га чэрвеня, а 8 гадз. увечары ў памяшканьні клюбу «Саўгандальслужачых» склікаецца

ЗЬЛЁТ УСЯГО КУЛЬТАКТЫВУ САЮЗУ САЎГАНДАЛЬСЛУЖАЧЫХ:

рабкораў, сьценкораў, рэдкалегій касьцепгазэт, культкамісій, клюбных працаўнікоў, брыгадзіраў па дапамозе ў правядзеньні справаздачна-перавыбарчай кампаніі МК.

У ПАРАДКУ ДНЯ: прапрацоўка пытаньняў аб культ. абслугоўваньні справаздачна-перавыбарчай кампаніі МК і рапарту асобных МК, дзе ёсьць чырвонага куткі, аб прыстасаваньні аконных да правядзеньня гэтай кампаніі.

На дапы зьлёт павінны зьявіцца, акрамя вышэй пералічанага актыву, члены МК і ГК, а таксама ўсе члены саюзу.

ВЫШЛА З ДРУКУ І ПАСТУПІЛА Ў ПРОДАЖ КНІГА

М. ВАСКАБОЙНІКАЎ і А. КУРЦІК

НА БАРАЦЬБУ ЗА ПРАМФІНПЛЯН.

Цана 20 кап. Стар. 148.

БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА.

КІНО ПЕТРАГРАДСКАЯ — Мастацкая кіно-аповесьць ВЕЦЕР у ТВАР. Пачатак 1-га сэансу а 7 г. Каса—ад 5 г. Звыш праграмы кіно-штомесячнік Белдзяржкіно „Беларусь Савецкая" № 6, прысьвечаны XIII зьезду КП(б)Б. У нумары: 1. Менская акруговая партканфэрэнцыя. 2. Адчыненьне XIII зьезду КП(б)Б. 3. Ксінбуд. 4. Зорныя пэлёсы піянэрскіх гарадкоў. 5. Універс. гарадок. 6. 25-гадовы юбілей літаратдзейнасьці Янкі Купалы. 7. Масавая экскурсія па Дняпрабуд.

КІНО САД (Савецкая) — Нямецкі фільм паводле павэлі СТЭФАНА ЦВЭЙГА. СТРАХ. драма ў 8 частках. Пачатак 1-га сэансу а 9 г., 2-га 10 г. 30 м. Каса з 6 гадз.

КІНО ПАЛЕТАРЫ — 2-гі ТЫДЗЕНЬ ТРУКАВЫ КІНО-РАМАН МІС МЭНД. 2 серыі—11 частак у адзін сэанс. У галоўнай ролі Ігар Ільінскі. Пачатак 1 сэансу а 7 гадз. — Каса з 5 гадз.

1-ы дзіцячы кіно-тэатр „Юны Піянэр" — Мастацкі фільм у 2-х серыях—12 частках. „КРАСНЫЕ ДЬЯВОЛЯТА". Абедзьве серыі ў адзін сэанс. Пачатак 1 сэансу з 2-х гадз. Каса з 12 г.

КІНО СПАРТАК — НЯМЕЦКІ ФІЛЬМ ВІНАВАТЫ (СУДОВАЯ ПАМЫЛКА). У галоўнай ролі Барнгард Гэтцке. Пачатак 1-га сэансу а 7 гадз. КІСП—ВД 5 г. 30 м.

Тэатр саду „Прафінтэрн" — Мастацкі перасовачны тэатр „КРАСНЫЙ ФАКЕЛ" Сёньня, 6 чэрвеня, для саюзу рабземлес „ИНГА" кам. у 4 дз. Глебавз Пач. а 8 г. 30 м. увеч.

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР — Гастролі 1-га Маскоўскага перасовачнага тэатру опэры і балету. Сёньня, 6 чэрвеня „ДЕМОН" опэра ў 4 дз. муз. Рубінштэйна. Пачатак а 8 г. 30 м. увеч.

Даводзіцца да ведама ўсіх беспрацоўных, якія лічацца на вучоце БЕЛПАСРЭДРАБІСУ, што з 7-га чэрвеня г.г. пачынаецца праверка кваліфікацыі беспрацоўных работнікаў мастацтва.

Усе беспрацоўныя работнікі мастацтва павінны не пазьней 7-га чэрвеня зьявіцца ў Белпасрэдрабіс для падачы заявы і запаўненьня анкеты на прадмет прахаджэньня экспэртызы. Тыя, хто не зьявіцца без грунтоўных прычын будуць зьняты з вучоту без права адпаўленьня.

Да экспэртызы будуць дапушчаны і тыя таварышы, якія знаходзяцца на сталай працы ў кіно-тэатральных і іншых мастацкіх прадпрыемствах.

Экспэртыза будзе адбывацца ў клюбе харчавікоў 7-га чэрвеня з 2-х гадз. дня, а ва ўсе астатнія дні з 11 гадз. раніцы. Даведкі па пытаньнях экспэртызы выдаюцца Белпасрэдрабісам штодзённа ад 10 гадз.